

# МІНСК — ІСЛАМАБАД: АКЦЭНТ НА РАЗВІЦЦЁ СУПРАЦОЎНІЦТВА

**У Беларусь з афіцыйным візітам прыбыў прэм'ер-міністр Пакістана Шахбаз Шарыф. Сёння чакаецца вялікі перагаворны дзень. Сустрэча Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі з высокім пакістанскім госцем пройдзе ў Палацы Незалежнасці ў вузкім і пашыраным складах з удзелам членаў дэлегацый. Лідары краін абмяркуюць ход рэалізацыі дамоўленасцей, дасягнутых у час афіцыйнага візіту кіраўніка беларускай дзяржавы ў Пакістан у лістападзе 2024 года. Акцэнт будзе зроблены на далейшым развіцці гандлёва-эканамічнага супрацоўніцтва, у тым ліку ў сферах прамысловасці і забеспячэння харчовай бяспекі, умацаванні гуманітарных сувязей. Асобную ўвагу бакі ўдзеляць ключавым пытанням глабальнага і рэгіянальнага парадку дня, узаемадзеянню дзвюх дзяржаў на міжнародных пляцоўках.**


РОДНАЯ ГАЗЕТА НА РОДНАЙ МОВЕ

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

11 КРАСАВІКА 2025 г. ПЯТНІЦА № 71 (30459)


ПАДРАБЯЗНАСЦІ

# КАЛІ ДЗЯТВУ ЗАКРУЖАЦЬ КАРУСЕЛІ?



Вясна ў самым разгары, а значыць, хутка адкрыюцца атракцыёны, дзе бацькі з дзецьмі змогуць актыўна бавіць вольны час. Як адзначыў намеснік генеральнага дырэктара — галоўны інжынер УП «Мінскзеленбуд» Руслан КАСЕВІЧ, у гэтым сезоне атракцыёны ў парках сталіцы плануюць запускаць у залежнасці ад надвор'я. СТАР. 10



АСНОВЫ ІДЭАЛОГІІ РАЗВІЦЦЯ ГРАМАДСТВА ЗАЦВЕРДЖАНЫ 2—4



РЭКВІЕМ ПА КОЖНЫМ ТРЭЦІМ, ЯКІ НЕЛЬГА СЛУХАЦЬ БЕЗ СЛЁЗ 8—9



**+TV ПРАГРАМА**

«ЖОРСТКІ РАМАНС»

# ШТО ЎМЕЮЦЬ МІНСКІЯ МАЙСТРАНЯТЫ?

**Сталічныя школьнікі паспаборнічалі ў чэмпіянаце прафмайстэрства**

Вызначэнне найлепшых у прафесіі — справа не новая. Звычайна ў такіх мерапрыемствах удзельнічаюць прафесіяналы, сапраўдныя майстры.

Цяпер жа паспрабаваць свае сілы ў конкурсе прафмайстэрства можна з самага ранняга ўзросту — у сталіцы прайшоў I Мінскі чэмпіянат прафесійнага майстэрства школьнікаў «Мінскія майстраняты», арганізатарам якога выступіў камітэт па адукацыі Мінгарвыканкама. СТАР. 15




**Яшчэ больш цікавых навін па-беларуску — у нашым тэлеграм-канале @zviazdaby. Падпісвайцеся, чытайце, будзьце ў курсе!**



ISSN 1990 — 763X

25071

## Дырэктыва Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь № 12

# АБ РЭАЛІЗАЦЫІ АСНОЎ ІДЭАЛОГІІ БЕЛАРУСКАЙ ДЗЯРЖАВЫ

Рэспубліка Беларусь адбылася як дзяржава, пабудаваная на прынцыпах народаўладдзя, гуманізму, сацыяльнай справядлівасці, роўнасці правоў і магчымасцяў, гістарычнай пераемнасці.

Павышэнню ўзроўню нацыянальнай самасвядомасці беларусаў, умацаванню сацыяльнай салідарнасці, грамадзянскага міру і згоды садзейнічалі прынятыя меры па фарміраванні ідэалагічнай вертыкалі, рэгуляванні ідэалагічнай сферы. Кірункі яе развіцця на сучасным этапе прадугледжваюць удасканаленне сістэмы ідэалагічнай работы, вывучэнне і ўлік рэальных інтарэсаў і запытаў насельніцтва, арыентаванасць на канкрэтныя сацыяльныя групы ў правядзенні дзяржаўнай інфармацыйнай палітыкі і забеспячэнне эфектыўнай камунікацыі ўлады і грамадства.

**У сувязі з неабходнасцю абагульнення і сістэматызацыі назапашанага вопыту, уніфікацыі падыходаў да арганізацыі ідэалагічнай работы ў краіне, актуалізацыі нарматыўнай прававой базы, якая рэгулюе ідэалагічную сферу, зыходзячы са змяненняў у сацыяльна-эканамічным, палітычным, духоўным жыцці, а таксама ў мэтах рэалізацыі дзяржаўнай палітыкі і развіцця ўсіх сфер жыцця грамадства:**

**1. Зацвердзіць Асновы ідэалогіі беларускай дзяржавы** (прыкладаюцца).

**2. Забяспечыць павышэнне эфектыўнасці арганізацыі ідэалагічнай работы. Пры гэтым:**

2.1. пад ідэалагічнай работай разумець мэтанакіраваную дзейнасць па практычнай рэалізацыі ідэалогіі беларускай дзяржавы;

2.2. мэтай ідэалагічнай работы вызначыць пабудову сацыяльна справядлівага грамадства праз фарміраванне ўсебакова развітой асобы, якая адстойвае нацыянальныя інтарэсы;

2.3. асноўнымі задачамі ідэалагічнай работы лічыць:

тлумачэнне і практычнае прымяненне ідэалогіі беларускай дзяржавы;

дасягненне разумення і шырокай падтрымкі насельніцтвам беларускай мадэлі грамадскага развіцця;

прапаганду дасягненняў Рэспублікі Беларусь;

умацаванне ў грамадстве адзінства, грамадзянскага міру, імкнення да стваральнай працы, узаемнага даверу дзяржавы і грамадства;

выхаванне патрыятызму, у тым ліку як гатоўнасці кожнага грамадзяніна абараняць інтарэсы дзяржавы, яе канстытуцыйны лад і тэрытарыяльную цэласнасць;

умацаванне нацыянальна-дзяржаўнай ідэнтычнасці, захаванне самабытнасці і забеспячэнне пераемнага развіцця;

стымуляванне актыўнага ўдзелу грамадзян у захаванні гістарычнай памяці і нацыянальных каштоўнасцяў;

павышэнне прававой, палітычнай, асабістай культуры і сацыяльнай адказнасці грамадзян;

зацвярджэнне высокіх маральных пачаткаў, справядлівасці, законнасці;

выхаванне маральна-псіхалагічных якасцяў, якія матывуюць на вырашэнне задач паспяховага развіцця краіны;

уцягванне ў працэс кансалідацыі грамадства ўсіх суб'ектаў рэалізацыі ідэалогіі беларускай дзяржавы;

забеспячэнне эфектыўнай камунікацыі ўлады і грамадства;

фарміраванне стваральнай павесткі ў грамадстве і яго абарону ад негатыўнага інфармацыйнага ўздзеяння;

умацаванне станоўчага міжнароднага іміджу краіны;

2.4. арганізаваць ідэалагічную работу з апорай на прынцыпы:

адзінства тэорыі і практыкі ідэалагічнай, кіраўнічай, гаспадарчай і арганізатарскай дзейнасці;

прызнання ўнікальнасці беларускай мадэлі грамадскага развіцця;

комплекснасці, сістэмнасці і навуковасці ў ажыццяўленні ідэалагічнай работы органаў дзяржаўнага кіравання ўсіх узроўняў, арганізацый усіх форм уласнасці, грамадскіх аб'яднанняў і палітычных партый;

датычнасці грамадзян да працэсу прыняцця рашэнняў, якія закранаюць іх інтарэсы, на ўзроўні арганізацыі, рэгіёна, галіны, дзяржавы;

прафесіяналізму і кампетэнтнасці ідэалагічных работнікаў.

**3. У якасці суб'ектаў рэалізацыі ідэалогіі беларускай дзяржавы вызначыць:**

дзяржаўныя органы, у тым ліку мясцовыя Саветы дэпутатаў, мясцовыя выканаўчыя і распарадчыя органы;

установы адукацыі, культуры, навукі, спорту, аховы здароўя, сацыяльнай абароны і іншыя грамадскія інстытуты;

юрыдычныя асобы, на якія ўскладзены функцыі рэдакцый сродкаў масавай інфармацыі;

грамадскія аб'яднанні і палітычныя партыі;

іншыя суб'екты гаспадарання.

Прыярытэтнымі сферамі, у якіх ідэалагічная работа знаходзіцца пад асаблівым кантролем дзяржавы, з'яўляюцца адукацыя, культура, навука, спорт, этнаканфесійныя адносіны, а таксама сямейная, маладзёжная, інфармацыйная і гістарычная палітыка.

Суб'ектам рэалізацыі ідэалогіі беларускай дзяржавы неабходна:

3.1. забяспечыць арганізацыю ідэалагічнай работы праз:

**інфармацыйную дзейнасць** — сістэму мерапрыемстваў па распаўсюджванні ўнутры краіны і за яе межамі інфармацыі ў інтарэсах беларускай дзяржавы для стварэння спрыяльнай інфармацыйнай абстаноўкі, якая адпавядае мэтам і задачам развіцця Рэспублікі Беларусь. Складнікамі інфармацыйнай дзейнасці з'яўляюцца:

інфармацыйна-прапагандысцкая работа — распаўсюджванне і растлумачэнне палітычна значнай інфармацыі шляхам правядзення аператыўнага, бягучага і тэматычнага інфармавання аб актуальных праблемах, абстаноўцы ў краіне і за мяжой;

контрпрапагандысцкая работа — комплекс мер па прадухіленні або мінімізацыі негатыўнага інфармацыйнага ўплыву і распаўсюджвання ў грамадстве дэструктыўных ідэй, інфармацыі і ідэалогіі праз выступленні ў працоўных калектывах, сустрэчы з насельніцтвам, а таксама па рэалізацыі іншых інфармацыйных мерапрыемстваў, у тым ліку з выкарыстаннем сродкаў масавай інфармацыі, інтэрнэт-рэсурсаў;

**выхаваўчую дзейнасць** — сістэму мерапрыемстваў па ўздзеянні на свядомасць, светапогляд, волю і пачуцці грамадзян у мэтах фарміравання ідэйна-маральнай асобы. Выхаваўчая дзейнасць уключае грамадзянска-патрыятычнае, сямейна-бытавое, духоўна-маральнае і прафесійнае выхаванне;

**сацыяльна-культурную дзейнасць** — сістэму мерапрыемстваў, накіраваных на павышэнне ўзроўню агульнай культуры насельніцтва, яго далучэнне да нацыянальных каштоўнасцяў, здаровага ладу жыцця, прафілактыку негатыўных сацыяльных праяў. Сацыяльна-культурная дзейнасць рэалізуецца праз сацыяльную падтрымку, прававую асвету, а таксама праз правядзенне культурна-масавых, спартыўных мерапрыемстваў, арганізацыю вольнага часу, калектыўнага адпачынку, развіццё мастацкай самадзейнасці;

3.2. укараняць і выкарыстоўваць наступныя кірункі ідэалагічнай работы:

фарміраванне і падрыхтоўка ідэалагічнага актыву, навучанне формам і метадам камунікацыі з грамадствам, калектывам і грамадзянамі;

вывучэнне грамадскай думкі;

укараненне і распаўсюджванне розных форм камунікацыі ўлады і грамадства, у прыватнасці адзіных дзён інфармавання, справаздач улады перад насельніцтвам, дыялогавых пляцовак, грамадскіх прыёмных, сустрэч з працоўнымі калектывамі і па месцы жыхарства грамадзян, грамадскіх абмеркаванняў;

распаўсюджванне і растлумачэнне грамадска значнай інфармацыі ў адпаведнасці з асноўнымі задачамі ідэалагічнай работы з дапамогай заснавання і арганізацыі дзейнасці сродкаў масавай інфармацыі і інтэрнэт-рэсурсаў;

стварэнне інфармацыйных і метадычных матэрыялаў, твораў літаратуры і мастацтва, аказанне паслуг, накіраваных на захаванне і папулярызацыю беларускай мадэлі грамадскага развіцця;

падтрымка, у тым ліку фінансавая, праектаў у галіне патрыятычнага выхавання, захавання і папулярызацыі гісторыка-культурных каштоўнасцяў і самабытнасці беларускага народа;

узаемадзеянне з рэлігійнымі арганізацыямі, зарэгістраванымі ў Рэспубліцы Беларусь, у пытаннях духоўна-маральнага выхавання насельніцтва, захавання традыцыйных каштоўнасцяў, прафілактыкі сацыяльнай неўладкаванасці, процідзеяння дэструктыўным рэлігійным плыням;

ацэнка мастацкай прадукцыі, рэкламы, інфармацыйнага, публіцыстычнага і забаўляльнага кантэнту на прадмет адпаведнасці асновам ідэалогіі беларускай дзяржавы;

арганізацыя і правядзенне мерапрыемстваў, прысвечаных дзяржаўнай сімволіцы, дзяржаўным святам, святочным дням і памятным датам;

3.3. рэалізоўваць кірункі ідэалагічнай работы з улікам спецыфікі вырашальных задач і існуючай абстаноўкі, а таксама на аснове вынікаў праведзеных навуковых і сацыялагічных даследаванняў.

**4. У мэтах далейшага ўдасканалення ідэалагічнай работы ў працоўных калектывах устанавіць, што:**

4.1. ідэалагічная работа ў працоўных калектывах накіравана на падтрымку ўнутранай і знешняй палітыкі Рэспублікі Беларусь, умацаванне спрыяльнага маральна-псіхалагічнага клімату, фарміраванне ў членаў працоўнага калектыву светапогляду, заснаванага на пачуцці патрыятызму, грамадзянскай сталасці, усведамленні прыналежнасці да беларускага народа, прафесійнай і асабістай адказнасці за дасягненне высокіх вынікаў у працы;

4.2. арганізацыя ідэалагічнай работы ў працоўных калектывах ускладаецца на кіраўніка арганізацыі, непасрэдная каардынацыя ідэалагічнай работы — на аднаго з яго намеснікаў. У выпадку неабходнасці дадаткова ўводзіцца пасада намесніка кіраўніка арганізацыі па ідэалагічнай рабоце;

4.3. арганізацыі ўсіх форм уласнасці:

выбудоўваюць сваю дзейнасць на аснове сацыяльнай адказнасці перад дзяржавай, грамадствам, працоўным калектывам і асобным грамадзянінам;

удзельнічаюць у вырашэнні грамадска значных пытанняў, у тым ліку шляхам рэалізацыі навукова-даследчых, адукацыйных, спартыўных, дабрачынных, экалагічных, гуманітарных і іншых праектаў;

забяспечваюць умовы для ўдзелу работнікаў у дзейнасці грамадскіх аб'яднанняў, прафесійных саюзаў на аснове патрабаванняў заканадаўства;

арганізуюць з членамі працоўнага калектыву інфармацыйную работу па разглядзе актуальных пытанняў развіцця арганізацыі, вобласці, рэгіёна, дзяржавы і вырашэння праблем, што ўздымаюцца грамадзянамі.

**5. Павысіць якасць ідэалагічнай работы ў краіне. У гэтых мэтах вызначыць наступнае:**

5.1. каардынацыя і аналіз эфектыўнасці, маніторынг арганізацыі і правядзення ідэалагічнай работы ў краіне, забеспячэнне ўзаемадзеяння дзяржаўных органаў, грамадскіх аб'яднанняў і іншых арганізацый у сферы ідэалогіі беларускай дзяржавы ўскладаюцца на Адміністрацыю Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь;

5.2. каардынацыя ідэалагічнай работы ў галінах (сферах дзейнасці), у тым ліку вызначэнне комплексных падыходаў да яе рэалізацыі ў падведамасных арганізацыях, узаемадзеянне з галіновымі прафсаюзамі, іншымі грамадскімі аб'яднаннямі, ускладаецца на ўпраўленні (аддзелы, сектары) ідэалагічнай работы дзяржаўных органаў. Гэта








работа ажыццяўляецца сумесна з мясцовымі выканаўчымі і распарадчымі органамі;

5.3. каардынацыя ідэалагічнай работы на адпаведнай тэрыторыі, у тым ліку вызначэнне комплексных падыходаў да яе рэалізацыі ў арганізацыях усіх форм уласнасці, а таксама дзейнасці арганізацыйных структур грамадскіх аб'яднанняў ускладаецца на камітэты (галоўныя ўпраўленні, упраўленні, аддзелы) ідэалагічнай работы і па справах моладзі мясцовых выканаўчых і распарадчых органаў;

5.4. прызначэнне на пасады, вызваленне ад пасад і падаўжэнне кантрактаў*:

намеснікаў старшынь рай-, гарвыканкамаў, за выключэннем Мінскага гарвыканкама, намеснікаў кіраўнікоў адміністрацый раёнаў у гарадах, якія каардынуюць ідэалагічную работу, старшынь камітэтаў, начальнікаў галоўных упраўленняў (упраўленняў, аддзелаў), загадчыкаў сектараў ідэалагічнай работы і па справах моладзі аблвыканкамаў (Мінскага гарвыканкама), рай-, гарвыканкамаў, адміністрацый раёнаў у гарадах, намеснікаў кіраўнікоў, якія каардынуюць ідэалагічную работу ў арганізацыях, падпарадкаваных Савету Міністраў Рэспублікі Беларусь, установах вышэйшай адукацыі, установах адукацыі і арганізацыях, якія рэалізуюць адукацыйныя праграмы навукова арыентаванай адукацыі, а таксама асоб, адказных за работу са сродкамі масавай інфармацыі ў дзяржаўных органах, узгадняюцца з Адміністрацыяй Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь;

галоўных рэдактараў дзяржаўных рэспубліканскіх сродкаў масавай інфармацыі, а таксама сродкаў масавай інфармацыі, заснавальнікамі якіх у рэгіёнах з'яўляюцца аблвыканкамы (Мінскі гарвыканкам), мясцовыя Саветы дэпутатаў абласнога ўзроўню, у галінах (сферах дзейнасці) — адпаведныя дзяржаўныя органы і арганізацыі, узгадняюцца з Міністэрствам інфармацыі і Адміністрацыяй Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь;

намеснікаў кіраўнікоў, якія каардынуюць ідэалагічную работу ў дзяржаўных і іншых арганізацыях з колькасцю работнікаў 600 чалавек і больш, установах адукацыі (за выключэннем названых у абзацы другім гэтага падпункта), якія рэалізуюць адукацыйныя праграмы прафесійна тэхнічнай адукацыі, установах сярэдняй спецыяльнай адукацыі, узгадняюцца з аблвыканкамамі (Мінскім гарвыканкамам);

намеснікаў кіраўнікоў, якія каардынуюць ідэалагічную работу ў дзяржаўных і іншых арганізацыях з колькасцю работнікаў да 600 чалавек, установах агульнай сярэдняй адукацыі, узгадняюцца з рай-, гарвыканкамамі, адміністрацыямі раёнаў у гарадах;

кіраўнікоў дзяржаўных рэгіянальных сродкаў масавай інфармацыі, заснавальнікамі якіх з'яўляюцца рай-, гарвыканкамы, мясцовыя Саветы дэпутатаў базавага ўзроўню, узгадняюцца з аблвыканкамамі і Міністэрствам інфармацыі;

5.5. для выканання функцый па каардынацыі ідэалагічнай работы Адміністрацыя Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь задзейнічае:

Нацыянальную акадэмію навук Беларусі, Міністэрства адукацыі, Акадэмію кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь — для навуковага, навукова-метадычнага суправаджэння ідэалагічнай работы;

Беларускі інстытут стратэгічных даследаванняў, Нацыянальную акадэмію навук Беларусі — для экспертна-аналітычнага і сацыялагічнага суправаджэння ідэалагічнай работы;

Міністэрства інфармацыі — для інфармацыйнага суправаджэння ідэалагічнай работы;

рэспубліканскае дзяржаўна-грамадскае аб'яднанне «Беларускае таварыства «Знанне» — для інфармацыйна-метадычнага суправаджэння ідэалагічнай работы.

**6. Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, дзяржаўным органам, у тым ліку мясцовым выканаўчым і распарадчым органам, праводзіць на сістэмнай аснове ацэнку эфектыўнасці ідэалагічнай работы.**

**7. Ускласці персанальную адказнасць за стан ідэалагічнай работы:**

у працоўным калектыве — на кіраўніка арганізацыі;

у рамках асобнай галіны (сферы дзейнасці) — на кіраўніка адпаведнага дзяржаўнага органа;

на тэрытарыяльным узроўні — на кіраўніка мясцовага выканаўчага і распарадчага органа.

**8. Дзяржаўным органам і іншым арганізацыям забяспечыць:**

штогадовае планаванне ідэалагічнай работы;

належную арганізацыю ідэалагічнай работы асобамі, адказнымі за яе правядзенне. Прымаць меры па павышэнні прафесійнага ўзроўню адказных асоб.

**9. Дзяржаўным органам, у тым ліку мясцовым выканаўчым і распарадчым органам, забяспечыць:**

разгляд на калегіях (саветах, пасяджэннях) пытанняў, якія датычацца розных аспектаў арганізацыі ідэалагічнай работы, не радзей як адзін раз у год;

прыцягненне суб'ектаў грамадзянскай супольнасці да ўдзелу ў рэалізацыі ідэалогіі беларускай дзяржавы.

10. Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь забяспечыць распрацоўку і давядзенне да зацікаўленых крытэрыяў, індыкатараў, перыядычнасці ацэнкі эфектыўнасці ідэалагічнай работы.

11. Асаблівасці арганізацыі ідэалагічнай работы ў дзяржаўных органах (арганізацыях), іх падраздзяленнях, якія ўваходзяць у склад сіл забеспячэння нацыянальнай бяспекі, вызначаюцца Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь.

12. Савету Міністраў Рэспублікі Беларусь у трохмесячны тэрмін забяспечыць прывядзенне актаў заканадаўства ў адпаведнасць з дадзенай Дырэктывай і прыняць іншыя меры па яе рэалізацыі.

13. Кантроль за выкананнем гэтай Дырэктывы ўскласці на Адміністрацыю Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

14. Прызнаць страціўшымі сілу ўказы Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь (дадатак).

15. Дадзеная Дырэктыва ўступае ў сілу ў наступным парадку:

пункты 1-11, 13 і 14 — праз тры месяцы пасля афіцыйнага апублікавання дадзенай Дырэктывы;

іншыя палажэнні гэтай Дырэктывы — пасля яе афіцыйнага апублікавання.

**Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь**
**Аляксандр ЛУКАШЭНКА.**

9 красавіка 2025 г. г. Мінск.

* Акрамя пасад, уключаных у кадравыя рэестры кіраўніка дзяржавы і Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь;

Дадатак
да Дырэктывы Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь № 12

## ПЕРАЛІК указаў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, якія страцілі сілу

1. Указ Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 16 чэрвеня 2003 г. № 254 «Аб дзейнасці інфармацыйна-прапагандысцкіх груп і аб удзеле кіраўнікоў рэспубліканскіх і мясцовых дзяржаўных органаў і іншых дзяржаўных арганізацый у ідэалагічнай рабоце».

2. Указ Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 29 жніўня 2003 г. № 369 «Аб унясенні змяненняў ва Указ Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 16 чэрвеня 2003 г. № 254».

3. Указ Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 20 лютага 2004 г. № 111 «Аб удасканаленні кадравага забеспячэння ідэалагічнай работы ў Рэспубліцы Беларусь».

4. Указ Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 10 верасня 2004 г. № 439 «Аб унясенні змяненняў ва Указ Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 16 чэрвеня 2003 г. № 254».

5. Указ Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 10 чэрвеня 2005 г. № 269 «Аб унясенні змяненняў ва Указ Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 16 чэрвеня 2003 г. № 254».

6. Падпункты 1.37 і 1.45 пункта 1 Указа Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 12 студзеня 2007 г. № 23 «Аб унясенні змяненняў і дапаўненняў ва ўказы Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, прызнанні страціўшымі сілу некаторых указаў і асобных палажэнняў указаў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь».

7. Указ Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 7 мая 2007 г. № 216 «Аб унясенні змяненняў ва Указ Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 16 чэрвеня 2003 г. № 254».

8. Пункт 10 дадатку да Указа Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 26 жніўня 2008 г. № 445 «Аб некаторых пытаннях органаў дзяржаўнай статыстыкі».

9. Указ Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 29 верасня 2010 г. № 502 «Аб унясенні змяненняў і дапаўненняў ва Указ Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 16 чэрвеня 2003 г. № 254».

10. Падпункт 1.8 пункта 1 Указа Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 1 жніўня 2011 г. № 338 «Аб унясенні змяненняў і дапаўненняў у некаторыя ўказы Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь».

**ЗАЦВЕРДЖАНА**
**Дырэктыва Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь № 12**

# АСНОВЫ ІДЭАЛОГІІ БЕЛАРУСКАЙ ДЗЯРЖАВЫ

У Рэспубліцы Беларусь сфарміравана ўласная мадэль грамадскага развіцця, якая стала практычным увасабленнем ідэалогіі беларускай дзяржавы.

Ключавымі дасягненнямі беларускай мадэлі грамадскага развіцця з'яўляюцца:

суверэнны характар унутранай і знешняй палітыкі;

высокі ўзровень грамадскай бяспекі, міжканфесійная і міжнацыянальная згода;

захаванне і мадэрнізацыя рэальнага сектара эканомікі;

высокі ўзровень занятасці насельніцтва, адсутнасць рэзкага сацыяльнага і маёмаснага расслаення;

даступнасць і высокая якасць медыцыны, адукацыі і сацыяльнага абслугоўвання;

стварэнне сучасных і роўных для ўсіх умоў заняцця масавым спортам, далучэння да культурнай і духоўнай спадчыны;

нізкі ўзровень карупцыі, сацыяльна адказны і нацыянальна арыентаваны дзяржаўна-кіраўнічы апарат.

Сучаснае жыццё характарызуецца ўзнікненнем новых відаў і форм занятасці, павышэннем адукацыйнага ўзроўню насельніцтва, змяненнем сацыяльнай структуры грамадства. Развіццё глабальнай камп'ютарнай сеткі Інтэрнэт, сацыяльных сетак, лічбавізацыя садзейнічаюць пераносу часткі грамадскіх адносін на віртуальныя пляцоўкі, з'яўляюцца новыя формы ўзаемадзеяння ўлады і грамадства. Даступнасць транспартнай інфраструктуры і інфармацыйная адкрытасць садзейнічаюць павышэнню мабільнасці насельніцтва, а таксама дыферэнцыяцыі каналаў атрымання інфармацыі. Фарміруецца беларуская грамадзянская супольнасць, якая раздзяляе з дзяржавай адказнасць за лёс краіны і народа.

У той жа час Беларусь сутыкаецца з пагрозай знешняй агрэсіі, якая прымае характар гібрыднага супрацьстаяння: інфармацыйныя войны, барацьба ідэй і сэнсаў, насаджэнне чужой дэструктыўнай ідэалогіі. Разнастайныя каналы давядзення інфармацыі выкарыстоўваюцца недружалюбнымі сіламі ў мэтах дэстабілізацыі палітычнай сітуацыі, нагнятання сацыяльнай напружанасці і дэфармацыі традыцыйных духоўна-маральных каштоўнасцяў. У першую чаргу разбуральнае ўздзеянне накіравана на сям'ю, сістэму адукацыі, традыцыйныя канфесіі, армію, інстытуты дзяржаўнай улады. Робяцца спробы сказіць гісторыю, абясцэніць ролю беларускага народа ў дасягненні перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне, адмаўляць яго генацыд з боку нацысцкіх злачынцаў і іх памагатых, уклад у агульны вынік працы савецкіх пакаленняў, поспехі суверэннага перыяду развіцця Беларусі.

У такіх умовах мабілізаваць грамадства на захаванне народнага адзінства, нацыянальнай ідэнтычнасці, нацэленасці на апераджальнае развіццё дазволяць трывалая ідэйная аснова, глыбокае разуменне грамадзянамі краіны асаблівасцяў беларускай мадэлі грамадскага развіцця.

Працяг на 4-й стар. ►








# АСНОВЫ ІДЭАЛОГІІ БЕЛАРУСКАЙ ДЗЯРЖАВЫ

Асновы ідэалогіі беларускай дзяржавы распрацаваны ў развіццё палажэнняў Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь і ў мэтах забеспячэння адзінства ідэй, поглядаў і ўяўленняў аб беларускай мадэлі грамадскага развіцця, абароны асобы, грамадства і дзяржавы ад дэструктыўнай ідэйнай і каштоўнаснай экспансіі.

*Ідэалогія беларускай дзяржавы* — сістэма ідэй, поглядаў і ўяўленняў, якая адлюстроўвае нацыянальна-гістарычныя традыцыі, інтарэсы і каштоўнасці беларускага народа, вызначае мэты развіцця асобы, грамадства і дзяржавы.

*Складовымі кампанентамі* ідэалогіі беларускай дзяржавы з'яўляюцца:

**культурна-гістарычны** — комплекс сталых перакананняў аб паходжанні народа, фарміраванні і развіцці яго самасвядомасці ад самабытнай этнічнай супольнасці да нацыі, якая ўсведамляе сваю прыналежнасць да ўсходнеславянскай цывілізацыі;

**палітычны** — сістэма ўяўленняў народа аб асноўных этапах фарміравання беларускай дзяржаўнасці, умовах станаўлення і асаблівасцях інстытутаў дзяржавы, грамадзянскай супольнасці, ступені іх адпаведнасці традыцыям, сучасным патрэбам і інтарэсам нацыі, кірунках і шляхах далейшага развіцця гэтых інстытутаў, а таксама аб месцы беларускай дзяржавы на міжнароднай арэне, яе мэтах, прынцыпах і прыярытэтах у выбудоўванні адносін з іншымі краінамі;

**эканамічны** — сістэма поглядаў адносна мадэлі арганізацыі эканамічнага жыцця краіны, якая прадугледжвае разумны баланс розных форм уласнасці і гаспадарання, разуменне ролі дзяржавы ў эканамічных працэсах, уяўленне аб справядлівым размеркаванні нацыянальнага багацця;

**сацыяльны** — сукупнасць ідэй аб салідарнасці, сацыяльнай справядлівасці, маральнасці, патрыятызме, абавязках, правах і свабодах чалавека, балансе інтарэсаў розных сацыяльных груп.

*Асноўныя палажэнні ідэалогіі беларускай дзяржавы.*

*Культурна-гістарычны* кампанент грунтуецца на прыналежнасці беларусаў да ўсходнеславянскага свету, цывілізацыйнай роднасці з рускім і ўкраінскім народамі.

Ядром фарміравання беларускай дзяржаўнасці сталі Полацкае і Тураўскае княствы. Таксама гістарычнымі формамі беларускай дзяржаўнасці, якія належаць і ўсім іншым датычным народам, з'яўляліся Старажытнаруская дзяржава, Вялікае княства Літоўскае, Рускае і Жамойцкае, Рэч Паспалітая, Расійская імперыя. Пачатак станаўленню нацыянальнай беларускай дзяржаўнасці дала Кастрычніцкая рэвалюцыя. Яе вынік — абвяшчэнне 1 студзеня 1919 г. ССРБ (пасля — БССР), якая ў якасці раўнапраўнага суб'екта выступіла адной з заснавальніц СССР. Рэспубліка Беларусь з 1991 года з'яўляецца правапераемніцай БССР. Рэальны суверэнітэт і незалежнасць беларускай дзяржавы былі дасягнуты ў перыяд пасля ўстанаўлення прэзідэнцкай формы праўлення.

У сілу свайго геаграфічнага размяшчэння на беларускіх землях гістарычна склалася этнаканфесійная разнастайнасць. Верацярпімасць, двухмоўе, мірнае суіснаванне прадстаўнікоў усіх канфесій і этнічных груп сталі найважнейшымі ўмовамі адзінства і згоды ў сучасным беларускім грамадстве.

Размяшчэнне на стыку дзвюх цывілізацый — паміж Усходам і Захадам — зрабіла жыццёва неабходным фарміраванне ў беларусаў такіх якасцяў, як стойкасць, мужнасць, рашучасць, самаахвярнасць. Цэментуючай асновай сучаснага беларускага грамадства выступае памяць аб усенародным супраціўленні нацызму і гераічным подзвігу беларускага народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны.

*Палітычны кампанент* ідэалогіі беларускай дзяржавы будуецца на прынцыпе пераемнасці этапаў грамадска-палітычнага развіцця беларускага грамадства і дзяржавы.

Ключавымі асновамі, якія садзейнічаюць устойлівасці беларускай палітычнай сістэмы, з'яўляюцца народаўладдзе, прэзідэнцкая рэспубліка як найбольш аптымальная форма праўлення, а таксама моцная дзяржаўная ўлада.

Дзяржаўны суверэнітэт — залог росквіту беларускага народа і тэрытарыяльнай цэласнасці дзяржавы. У сваю чаргу роўнасць усіх перад законам, грамадзянская згода і адзінства нацыі выступаюць галоўнымі ўмовамі рэалізацыі беларускай мадэлі грамадскага развіцця.

Рэспубліка Беларусь з'яўляецца дзяржавай — заснавальніцай ААН, раўнапраўным суб'ектам міжнародных адносін, які выступае за прызнанне разнастайнасці шляхоў устойлівага развіцця.

Беларусь адданая агульнапрызнаным прынцыпам міжнароднага права, перш за ўсё суверэннай роўнасці дзяржаў, непарушнасці граніц, мірнага ўрэгулявання спрэчак, неўмяшання ва ўнутраныя справы іншых краін, непадзельнасці бяспекі.

Знешняя палітыка краіны накіравана на падтрыманне міру, выключэнне этнічнай, нацыянальнай, рэлігійнай і іншай варожасці, фарміраванне і ўмацаванне шматпалярнасці ў сферы міжнародных адносін, узаемавыгаднае і раўнапраўнае супрацоўніцтва з іншымі краінамі і народамі, павагу права выбару імі свайго шляху.

У рамках *эканамічнага кампанента* дзяржава праводзіць сацыяльна арыентаваную эканамічную палітыку, мэтай якой з'яўляецца забеспячэнне сацыяльнай справядлівасці і дабрабыту грамадзян праз прадастаўленне кожнаму роўных магчымасцяў, справядлівае размеркаванне даброт, падтрыманне годнага ўзроўню жыцця.

Гарантыяй дасягнення пастаўленай мэты выступае наяўнасць у дзяржавы прыродных, матэрыяльных, духоўных, інтэлектуальных рэсурсаў, якія маюць агульнанацыянальнае значэнне, у тым ліку прызнаных грамадствам унікальнымі.

Беларуская эканамічная мадэль грунтуецца на працавітасці і прафесіяналізме як універсальных мерках сацыяльнага поспеху і грамадскага прызнання, удзеле членаў працоўных калектываў у кіраванні арганізацыямі для павышэння эфектыўнасці іх работы і паляпшэння ўзроўню жыцця народа.

Беларуская эканамічная мадэль прадугледжвае дзяржаўнае рэгуляванне эканамічнай дзейнасці ў інтарэсах чалавека і грамадства, збалансаванае развіццё матэрыяльнай вытворчасці і сферы паслуг, шырокае выкарыстанне перадавых дасягненняў айчынных і замежных навукі і тэхнікі, беражлівыя адносіны да прыроды і руплівае выкарыстанне рэсурсаў.

Павышаная ўвага з боку дзяржавы ўдзяляецца забеспячэнню эканамічнай бяспекі, асабліва энергетычнай і харчовай.

*Сацыяльны кампанент* ідэалогіі беларускай дзяржавы вызначаецца зацвярджэннем і культываваннем у грамадстве традыцыйных духоўных каштоўнасцяў, духоўных і маральных арыенціраў, гуманнасці і салідарнасці, сацыяльнай справядлівасці і недапушчэння расслаення і дыскрымінацыі.

Міжасобаснае ўзаемадзеянне, заснаванае на добразычлівасці, памяркоўнасці, узаемапавазе, разважлівасці, дазваляе розным сацыяльным і нацыянальным групам выбудоўваць раўнапраўны і канструктыўны дыялог.

Кансалідацыі беларускага грамадства садзейнічае калектывізм як форма жыццядзейнасці, якая прадугледжвае прыхільнасць грамадзян да агульнай справы, гатоўнасць аказваць дапамогу адзін аднаму ў дасягненні агульных стваральных мэт.

Беларусы застаюцца вернымі традыцыйным сямейным каштоўнасцям, што абумоўлівае гарманічнае фарміраванне маральнай, інтэлектуальнай і фізічна развітой асобы.

Адносіны чалавека, грамадства і дзяржавы заснаваны на вяршэнстве права, балансе інтарэсаў, сацыяльным аптымізме, узаемных клопаце, адказнасці і абавязацельствах.

Гатоўнасць абараняць канстытуцыйны лад, суверэнітэт і незалежнасць Рэспублікі Беларусь, фарміраванне пазітыўнага вобраза сваёй краіны, умацаванне міжпакаленчых сувязяў, захаванне і папулярызацыя ўласных культурных традыцый і духоўных каштоўнасцяў — свяшчэнны абавязак кожнага беларуса.

Рэалізацыя асноў ідэалогіі беларускай дзяржавы будзе садзейнічаць захаванню дзяржаўнага суверэнітэту, забеспячэнню нацыянальнай бяспекі, развіццю беларускага народа як унікальнай гістарычнай супольнасці, самарэалізацыі чалавека ў гармоніі з грамадскімі патрэбамі.

# РАССТАЎЛЕНЫ АКЦЭНТЫ Ў РАЗУМЕННІ БЕЛАРУСКІХ СЭНСАЎ І НАРАТЫВАЎ

## Дырэктыву № 12 каменціруе намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта



Адзін з найважнейшых дакументаў — Дырэктыва № 12 «Аб рэалізацыі асноў ідэалогіі беларускай дзяржавы» — быў падпісаны 9 красавіка Прэзідэнтам Беларусі. Гэта чаканы дакумент, перш за ўсё таму, што вялося нямала дыскусій аб тым, у якім кірунку развівацца і што браць за аснову ў рабоце ў ідэалагічнай прасторы. Аб значнасці дакумента БелТА расказаў намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Уладзімір ПЯРЦОЎ.

**— Уладзімір Барысавіч, наколькі значным, своечасовым і неабходным з'яўляецца гэты дакумент?**

— Час для такога дакумента аб'ектыўна настаў. Прэзідэнт часта ў апошнія гады вяртаўся да пытанняў ідэалогіі, нацыянальнай ідэі, каштоўнасцяў і сэнсаў. Заняцца ідэалогіяй, прапагандай і контрпрапагандай было яго прамым даручэннем. І мы над гэтым даволі актыўна працавалі.

Калі гаварыць коратка, то па сутнасці гэта дырэктыва — своеасаблівая дарожная карта, якая неабходна, каб апісаць простай і зразумелай мовай канцэпцыю дзяржаўнасці, зрабіць адзінымі падыходы да арганізацыі і праведзення ідэалагічнай работы па ўсёй краіне — у навучальных установах, на прадпрыемствах, каб данесці дзяржаўную павестку ў тым ліку да грамадзян, занятых у прыватным сектары. Можна сказаць, што дакумент вызначае адзіныя правілы гульні ў ідэалагічным полі.

**— Як ішла падрыхтоўка дакумента, хто прымаў удзел у распрацоўцы?**

— Да работы былі падключаны рэспубліканскія і рэгіянальныя дзяржорганы, экспертная і навуковая супольнасці, прадстаўнікі сродкаў масавай інфармацыі і грамадзянскай супольнасці.

Пры Адміністрацыі Прэзідэнта была створана рабочая група, якая прыводзіла да аднаго цэлага вялікую колькасць прапаноў, меркаванняў і пазіцый. Работа была праведзена каласальная. Пры гэтым галоўным крытэрыем быў адзін — ісці ад жыцця. Гэты прэзідэнцкі прынцып дапамагаў адкідаць усё наноснае, штучнае і надуманае, таму дакумент, на мой погляд, атрымаўся максімальна практыкаарыентаваным.

У сухім астатку дырэктыва як указ праграмнага характару вырашае ключавыя задачы: у ёй вызначаюцца ідэйныя арыенціры беларускага грамадства на сучасным этапе развіцця, раскрываецца механізм рэалізацыі ідэалагічнай работы, устанаўліваецца ацэнка эфектыўнасці ідэалагічнай работы. А гэта таксама вельмі важны момант для эфектыўнай рэалізацыі дакумента.

Бо на практыцы мы бачылі, што ёсць пэўныя нюансы ў ідэалагічнай прасторы, якія трэба ўстараняць. Для разумення: да ўчарашняга дня ў ідэалагічнай рабоце мы кіраваліся дакументамі 2003 і 2004 гадоў, якія, відавочна, састарэлі для работы ў сучасных рэаліях. Пры гэтым яшчэ і падыходы да ідэалагічнай работы адрозніваліся ад рэгіёна да рэгіёна. І таму было важна абагульніць увесь вопыт і ўстанавіць адзіныя падыходы ў практычных кірунках ідэалагічнай работы па ўсёй краіне.

**— Што прымалася да ўвагі пры фарміраванні асноў ідэалогіі беларускага грамадства, якія зацвердзіла падпісаная Прэзідэнтам Дырэктыва № 12?**

— Сапраўды, найбольш важны складнік дырэктывы — зацверджаныя ёю асновы ідэалогіі беларускага грамадства. Гэта свайго роду буквар грамадзяніна краіны. Гэта ёмістае і сціслае апісанне жыцця беларускага грамадства і дзяржавы ў праламленні мінулага, сучаснасці і будучыні. Расстаўлены акцэнты ў разуменні беларускіх сэнсаў і наратываў.

Адначасова хачу сказаць усім крытыкам. Размова не ідзе аб насаджэнні нейкага аднадумства, размова ідзе аб неабходнасці валодання грамадзянамі краіны дакладнымі, зразумелымі ведамі асноў жыцця сваёй краіны. Кашы ў галовах людзей быць не павінна!

Калі мы хочам выхаваць думаючых, патрыятычных, гатовых у выпадку неабходнасці ўстаць на абарону сваёй краіны грамадзян, якія дакладна ўсведамляюць, «што такое добра і што такое дрэнна», то павінна весціся адпаведная работа, павінны прапагандавацца ў грамадстве адпаведныя ідэалы і каштоўнасці. І мы гэта будзем рабіць.

Гэта цудоўна ведаюць і нашы так званыя заходнія настаўнікі. Нам яны навязваюць прынцыпы плюралізму, а ў сябе ўводзяць пакаранні, аж да крымінальных, за спробы перагляду ўстояных ісцін гісторыі і сучаснасці сваёй дзяржаўнасці.

Немагчыма ўявіць сабе немца, італьянца ці паляка, які разважае аб мэтазгоднасці адзінства сваёй дзяржавы, аб нейкіх альтэрнатыўных падыходах да асэнсавання мінулага. Думкі ў галаве такой няма і быць не можа — настолькі прадумана і дакладна сфарміравана канцэпцыя дзяржаўнасці і настолькі ж эфектыўна яна ўкараняецца праз усе сферы жыцця. Такая ж аднаназначнасць у ацэнках павінна быць і ў нас.

І ў завяршэнне, калі гаварыць пра ключавыя аспекты дырэктывы, трэба звярнуць увагу на тое, што ў дакуменце дакладна вызначаюцца паняцце, мэта, задачы, асноўныя формы ідэалагічнай работы, суб'екты яе рэалізацыі. Акрамя таго, дырэктыва ўстанаўлівае ключавыя падыходы да арганізацыі ідэалагічнай работы ў працоўным калектыве і прадугледжвае абавязак рэалізацыі асноў ідэалогіі беларускай дзяржавы ва ўсіх сферах і суб'ектах гаспадарання незалежна ад формы ўласнасці. Персанальная адказнасць за стан ідэалагічнай работы ўскладаецца на кіраўніка калектыва ці галіны.



# «Я ЛЮБЛЮ І ПАВАЖАЮ СВОЙ НАРОД»

## Падрабязнасці інтэрв'ю Аляксандра Лукашэнкі МТРК «МІР»

Як мы ўжо паведамлялі, Прэзідэнт Беларусі ў аўторак даў інтэрв'ю кіраўніку Міждзяржаўнай тэлерадыёкампаніі «МІР» Радзіку Батыршыну. Учора ўвечары яно выйшла ў эфір, а мы для сваіх чытачоў падрыхтавалі свайго роду пераказ па закранутых у гутарцы тэмах.

### ПРА ДЭМАКРАТЫЮ І ТАТАЛІТАРЫЗМ

Падчас інтэрв'ю Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што рэгулярна глядзіць тэлеканал «МІР», паколькі яму цікава, што адбываецца на постсавецкай прасторы. Акрамя таго, паводле слоў Прэзідэнта, журналісты гэтай тэлерадыёкампаніі аб'ектыўна асвятляюць падзеі і ў іншых краінах — непрадузята канстатуюць факты.

«Гэтага, дарэчы, сёння не хапае. У свеце не хапае. І як бы там ні пышыліся амерыканцы, французы і іншыя, яны не проста прапагандысты — гэта больш, чым прапаганда. Гэта ніякай дэмакратыі, гэта суцэльны таталітарызм. А нам яны паднosілі сябе вунь як», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

Аляксандр Лукашэнка згадаў сітуацыю з лідарам французскай партыі «Нацыянальнае аб'яднанне» Марын Ле Пэн, якую прызналі вінаватай у злоўжыванні сродкамі Еўрапейскага саюза, а таксама судовы працэс па справе кіраўніка Гагаузскай аўтаноміі Малдовы Яўгеніі Гуцул (яе абвінавачваюць у парушэннях пры фінансаванні апазіцыйнай партыі «Шор», ліквідаванай). Шмат хто лічыць, што абедзве справы палітычна матываваныя.

«У любой краіне гэта жудасць. Гэта жудасць. Ніякай там дэмакратыі не было. А тое, што было, яны акуратна хавалі пад сукно. Пад плінтус схавалі, і мы: «Ах, якая дэмакратыя. Давайце паўторым». Мы з расіянамі паўтаралі. Яны (заходнія партнёры. — **«Зв.»**) прыйшлі да нас з нейкімі эканамічнымі прапановамі, інвестыцыямі, прадпрыемствы адкрылі, недзе прыватызавалі (не ў нас, у Расіі ў асноўным). А потым, як толькі адмашку атрымалі, усе збеглі.

Дзякуй богу, што збеглі. Яны ж нічога з сабой не знеслі. Нам розуму хапіла пакінуць усё тое, што было напрацавана нашымі людзьмі і іх спецыялістамі. Гэта аснова нашага імпартазамяшчэння і канкурэнтаздольнасці», — падкрэсліў беларускі лідар.

### ПРА ВАЙНУ, ПАМЯЦЬ І ПРАЎДУ

«Мы занадта шмат сёння гаворым аб нашай Перамозе, аб гераізме нашага народа, аб генацыдзе супраць савецкага народа, супраць нашага народа. Гэта ўсё правільна, гэта праўда, але наколькі пранікнёна, наколькі пачуццёва мы гэта робім звычайна? Бо прайшло 80 гадоў ужо — адзінкі засталіся з тых, якія ўсё гэта перажылі», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

«Для мяне гэта пранікліваы рэчы. І ў той час, калі ўжо засталося зусім няшмат людзей, нам трэба, прабачце, не языком ляпаць, а адчуваць, што гэта такое, каб данесці да нашай моладзі, хаця б да наступнага пакалення, што гэтая Перамога была, што ёю трэба ганарыцца.

> **А адказнасць заключаецца яшчэ і ў тым, што Беларусь як ніякая іншая рэспубліка была падвергнутая нападу нацызму. Яна была наогул сцёртая з твару зямлі.**

Добра, што беларусы людзі цярплівыя, яны ўмеюць і працаваць, і цяжкасці перажываць, і хавацца ў лесе, і гэтак далей. Вось яны і засталіся. Мы лічылі, што ў нас кожны чацвёрты чалавек загінуў. Нічога падобнага: кожны трэці загінуў, мы гэта сапраўды ведаем. Я баюся, каб яшчэ больш не было», — заявіў кіраўнік дзяржавы.

«Найвялікшая адказнасць — спасылацца на тое, што было, і рабіць гэта нашым здабыткам, сваім здабыткам. Я не ваяваў тады, але тым не менш гэта мая Перамога. Гэта Перамога таго пакалення людзей, якія жылі ў Савецкім Саюзе і ў Беларусі. І калі ты пра гэта гаворыш, ты павінен за гэта несці найвялікшую адказнасць», — сказаў Прэзідэнт.

Прэзідэнт расказаў, чаму Германія забываецца пра ўрокі Другой сусветнай вайны.

«Сышоў страх разам з тым пакаленнем, якое сюды прыйшло да нас ваяваць. Відавочцы зніклі, з'явілася новае пакаленне. І ў іх палітыка, якая навязваецца дзяржавамі, што размешчаны яшчэ на захад ад іх. Тымі ж англічанамі, Злучанымі Штатамі Амерыкі. І немцы паплылі, мякка кажучы. Яны забыліся пра ўсё, што было. Але часам у іх праскоквае: «Не-не, там на Усходзе нам не месца, мы там ваяваць не павінны. Не-не, да рускіх не пойдзем». Гэта значыць, у іх, у іх унукаў яшчэ нейкая памяць прачынаецца. Але гэта, ведаеце, голас адзінокага ў пустыні. Не больш», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Журналіст у час інтэрв'ю папрасіў Прэзідэнта пракаменціраваць адну з яго мінулых цытат — «Скрасці можна памяць, але не праўду». Кіраўнік дзяржавы растлумачыў, што памяць можна затуманіць, сапсаваць або павярнуць у любы бок. Але паколькі праўда — гэта жывыя факты, ад іх нікуды не падзецца.

Ён нагадаў аб фактах генацыду беларускага народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны. «Я сумняваюся ўжо, што ёсць месцы, дзе няма гэтых магіл. Мы раскапалі гэту магілу — вось глядзіце, колькі загінуўшых людзей. Гэта праўда аб тым часе, як ты яе ўкрадзеш? Ты яе не ўкрадзеш: яна заснавана на канкрэтных фактах, на канкрэтнай, не скажонай гісторыі», — дадаў Аляксандр Лукашэнка.

### ПРА СУПРАЦОЎНІЦТВА З РАСІЯЙ І БЯСПЕКУ

Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу, што заключаны з Расіяй дагавор аб гарантыях бяспекі ў рамках Саюзнай дзяржавы забяспечвае Беларусі поўную бяспеку. «Ніхто не будзе ваяваць з ядзернай краінай, якая б яна ні была... Так, у палякаў, прыбалтаў і гэтак далей свае планы, але неяк прыціхлі. Чаму? Я не кажу пра немцаў: яны немцы дурасцю пакутуюць. Чаму прыціхлі? Я чытаю іх заявы, дакладваюць мне: баяцца», — адзначыў кіраўнік дзяржавы.

Прэзідэнт раскрыў падрабязнасці вучэнняў «Захад-2025», якія пройдуць у сярэдзіне верасня. Ён расказаў, што нядаўна абмяркоўваў іх з Уладзімірам Пуціным. «Асноўную ролю з-за пэўных прычын павінна адыграць Беларусь. Надышоў час і нам паказаць, што мы шмат чаго ўмеем. Тут будуць прысутнічаць і расійскія войскі. Таму мы будзем рабіць усё для таго, каб абараніць нашу агульную Айчыну», — заявіў беларускі лідар.

У кіраўніка дзяржавы пацікавіліся, ці ўлічваюць Беларусь і Расія ў рамках Саюзнай дзяржавы новыя пагрозы, якія ўзнікаюць у сувязі з эскалацыяй канфлікту на Блізкім Усходзе, магчымасцю ўзнікнення канфлікту з удзелам Ірана і іншымі падзеямі.

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што не ўлічваць гэта Расія не можа. У той жа Сірыі ў яе дзве вайсковыя базы. Іран — саюзнік Расіі. «Таму Расія не можа быць убаку, а мы — саюзнікі Расіі. У нас адзіная абаронная прастора», — сказаў кіраўнік дзяржавы, звярнуўшы ўвагу, што ў Беларусі таксама цесныя адносіны з Іранам і краінамі Блізкага Усходу.

«Мы ўлічваем усе гэтыя канфлікты. Мы бачым, што гэта канфліктнасць расце. І будзе расці, таму што гэта працяг дыпламатычных, палітычных і эканамічных войнаў і супярэчнасцяў. Сёння ідзе гандлёвая, эканамічная вайна. Ясна, што (не дай бог, ўядома) яна можа перарасці ў ваеннае супрацьстаянне. Усё ўзаемазвязана. Таму нельга не ўлічваць гэтага», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

### АБ СНД, ЕАЭС І БРІКС

У час інтэрв'ю размова зайшла аб патэнцыяле такіх інтэграцыйных аб'яднанняў, як СНД і ЕАЭС. Прэзідэнт прызнаў, што ў гэтых структурах ёсць пэўныя супярэчнасці, але ў святле апошніх падзей і ўведзеных супраць Беларусі і Расіі санкцый некаторыя краіны, якія не ўваходзяць у ЕАЭС (напрыклад, Азербайджан, Узбекістан, Таджыкістан), сталі больш прыглядацца да гэтага саюза, зблізіць пазіцыі. «Ёсць нейкія нюансы, якія трэба ўбіраць (і мы стараемся гэта рабіць), каб гэтыя рэспублікі падцягнуць у ЕАЭС», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Калі ў будучым гэта адбудзецца і да ЕАЭС далучацца былыя постсавецкія рэспублікі, існаванне СНД перастане быць неабходным. «СНД, я думаю, сам сабой адпадзе, паколькі ўсе рэспублікі паднімуцца на больш высокі ўзровень і ўвойдуць у склад ЕАЭС», — сказаў Аляксандр Лукашэнка, не выключыўшы, што ў перспектыве да ЕАЭС могуць далучыцца Украіна і Грузія.

Адной з тэм, закранутых падчас інтэрв'ю, быў удзел Беларусі ў БРІКС, дзе яна нядаўна атрымала афіцыйны статус краіны-партнёра. Гаворачы аб тым, якія перспектывы гэта адкрывае, кіраўнік дзяржавы падкрэсліў: «БРІКС — гэта будучыня».

Прэзідэнт перакананы ў вялікіх перспектывах БРІКС і важнасці ўдзелу Беларусі ў гэтай арганізацыі. «БРІКС — гэта вядучыя дзяржавы свету, з якімі мы супрацоўнічаем. Што дрэннага, што мы за адным сталом з імі знаходзімся? Мы туды ідзём для таго, каб забяспечыць нармальнае існаванне сваёй дзяржавы, абапіраючыся на сваіх сяброў, на сваіх суседзяў, на Расійскую Федэрацыю, на Кітайскую Народную Рэспубліку, Бразілію, у нас нармальныя адносіны з іншымі дзяржавамі, якія ўваходзяць у склад БРІКС».

### ПРА ДЭМАКРАТЫЮ І НАРОД

Кіраўніка дзяржавы папрасілі пракаменціраваць сказаныя ім раней словы аб тым, што ў Беларусі больш дэмакратыі, чым у тых краінах, якія называюць сябе яе эталонам. Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што за той час, пакуль ён у палітыцы, даводзілася назіраць «усякую іх дэмакратыю», і прыгадаў шматлікія прыклады зусім не дэмакратычных рашэнняў і мер у краінах Захаду, якія называюць сябе апорай дэмакратыі, у прыватнасці, адхіленне ад барацьбы за ўладу непажаданых палітыкаў.

У развіццё тэмы Прэзідэнт нагадаў, як у 2020 годзе Захад папракаў Беларусь у недэмакратычнасці з-за абвінавачанняў у адносінах да банкіра Віктара Бабарыкі, хоць на самай справе яны былі выстаўлены на абсалютна законных падставах. «Слухайце, як яны нас «бамбілі»!.. А зараз што?» — задаў рытарычнае пытанне кіраўнік дзяржавы.

«Вось іх «дэмакратыя». А як у іх выбары праводзяцца? Вазьміце, да прыкладу, Злучаныя Штаты Амерыкі, мінулыя выбары (2020 года. — **«Зв.»**), калі Трампа беднага «бамбілі», «малацілі», у турму ледзь не пасадзілі. Па пошце галасавалі, потым знаходзілі пад плотам ці недзе на сметніцы бюлетэні. У рэшце рэшт Байдэн стаў Прэзідэнтам, — прывёў яшчэ адзін прыклад Аляксандр Лукашэнка. — Дык яго ж і потым (Трампа пасля выбараў 2020 года. — **«Зв.»**) па судах цягалі, потым стралялі... Гэта што, дэмакратыя? Вось іх дэмакратыя».

Кіраўнік дзяржавы звярнуў увагу, што прэзідэнцкія выбары ў Беларусі ў 2025 годзе прайшлі ціха і спакойна, што пацвердзілі шматлікія назіральнікі, у тым ліку міжнародныя. Аднак станоўчай рэакцыі з боку Захаду ўсё роўна не было. Замест гэтага зноў былі заезджаныя папрокі аб нібыта адсутнасці ў Беларусі дэмакратыі.

> **«Я бязмерна паважаю беларусаў. Я іх цаню за іх мінулае, гісторыю (я яе добра ведаю). Гэта найпрацавіцейшы народ, — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы. — Мы — людзі працавітыя. Будзем яшчэ лепш жыць (дзякуючы сваёй працавітасці. — «Зв.»), людзі гэта разумеюць. Таму — я люблю і паважаю свой народ».**

Прэзідэнт звярнуў увагу, што палітыкі ў дэмакратычных (якімі яны самі сябе лічаць) краінах часта гавораць публічна адно, а робяць зусім супрацьлеглае. «Камеру ўбачылі, чагосьці набалбаталі, налапаталі на камеру, заяву зрабілі — і ўсё. А палітыка зусім іншая: людзей не любіць, людзей не паважаюць. «Дэмас» — народ, «кратас» — улада. Як жа вы ажыццяўляеце ўладу ў інтарэсах гэтага народа?» — рытарычна спытаў кіраўнік дзяржавы.

Прэзідэнт звярнуў увагу, што Беларусь на працягу многіх гадоў развіваецца як сацыяльна арыентаваная дзяржава, дзе, у прыватнасці, для грамадзян бясплатная адукацыя і ахова здароўя. «У нас шмат чаго для людзей робіцца, — прадоўжыў Аляксандр Лукашэнка. — Магчымасці для таго, каб зарабіць, каласальныя. Але трэба працаваць. Права на жыццё чалавека. Назавіце мне іншую такую краіну, дзе так вось калоцяцца і дрыжаць за жыццё чалавека? Патрапіў у бяду чалавек або група людзей, не дай бог, — мы ўсе там, мы дапамагаем. Гэта што, не дэмакратыя? Дзе, у якой краіне заходняй, так званай дэмакратыі, якія нас вучылі гэтай дэмакратыі, дзе гэта ёсць? Нідзе няма».

### ПРА ВЫХАВАННЕ ДЗЯЦЕЙ

У інтэрв'ю МТРК «Мір» Аляксандр Лукашэнка шчыра адказаў і на пытанні асабістага характару. Радзік Батыршын пацікавіўся, як Аляксандр Лукашэнка праводзіць час са сваімі дзецьмі і ўнукамі.

«Я часта кажу: бацька для сыноў павінен быць прыкладам. Не тое, што «Вось глядзіце, які я вялікі, я Прэзідэнт». Не. Калі ты хочаш, каб тваё дзіця займалася спортам,— за руку і з сабой, і сам бяжы. Калі ты хочаш, каб тваё дзіця займалася музыкай, і ў яго ёсць здольнасці (у мяне старэйшы сын і малодшы сын якраз музычныя школы скончылі), я, бачачы іх здольнасці, спецыяльна даручыў спецыялістам пераправерыць. Яны мне шчыра сказалі: «Так, у іх ёсць здольнасці». І аддаў у музычную школу. Гэта вельмі важна для развіцця, — падзяліўся рэцэптам выхавання Аляксандр Лукашэнка. — Замежная мова — без яе нікуды... Разумеючы, што яму трэба, ты павінен дапамагчы яму гэта асвоіць. Або весці за сабой... Ты павінен быць для сваіх дзяцей прыкладам, не толькі для хлапчукоў, але і для дзяўчынак у тым ліку».

**ИЗВЕЩЕНИЕ**
**акционеров открытого акционерного общества**
**«Минсктелекомстрой»**
**о проведении внеочередного общего собрания акционеров**

Дата проведения внеочередного общего собрания акционеров – **21 апреля 2025 года.**

Время начала проведения внеочередного общего собрания акционеров – **16.00.**

Место проведения внеочередного общего собрания акционеров – **г. Минск, ул. Аннаева, 49/1-1, кабинет 326.**

Дата составления списка лиц, имеющих право на участие во внеочередном общем собрании акционеров, – **11 апреля 2025 года.**

Форма проведения внеочередного общего собрания акционеров – **очная.**

**ПОВЕСТКА ДНЯ СОБРАНИЯ**

**1.** О проведении новой инвентаризации имущества и обязательств открытого акционерного общества «Минсктелекомстрой» в связи с изменением срока реорганизации.

**Порядок регистрации лиц, имеющих право на участие во внеочередном общем (годовом) собрании акционеров:**

- время регистрации участников внеочередного общего собрания акционеров – **с 14.00 до 15.40** в день проведения внеочередного общего собрания акционеров;
- руководитель акционера (юридического лица) должен предъявить группе регистрации документ, удостоверяющий личность, а также документ, подтверждающий полномочия руководителя, – копию контракта, который должен быть передан группе регистрации;
- акционер (физическое лицо) должен предъявить документ, удостоверяющий личность;
- представитель акционера (юридического или физического лица) должен предъявить документ, удостоверяющий личность, и оригинал доверенности, которая должна быть передана группе регистрации.

**Порядок ознакомления с информацией (документами) лицами, имеющими право на участие во внеочередном общем собрании акционеров:**

информация (документы), подготовленные к внеочередному общему собранию акционеров, могут быть предоставлены акционеру Общества (его представителю) в виде копий документов для ознакомления.

При ознакомлении с информацией (документами), подготовленными к внеочередному общему собранию акционеров, не допускается их фото- и (или) видеофиксация, выдача их нарочно;

- руководитель акционера (юридического лица) должен предъявить документ, удостоверяющий личность, а также документ, подтверждающий полномочия руководителя, – копию контракта, который должен быть передан лицу, определенному директором Общества для выполнения этих функций;
- акционер (физическое лицо) должен предъявить документ, удостоверяющий личность;
- представитель акционера (юридического или физического лица) должен предъявить документ, удостоверяющий личность, и оригинал доверенности, который должен быть передан лицу, определенному директором Общества для выполнения этих функций.

С информацией (документами), подготовленные к внеочередному общему собранию акционеров, можно ознакомиться в рабочие дни (понедельник – пятница) **с 14 по 18 апреля 2025 года включительно в период времени с 14.00 по 15.00 по адресу: г. Минск, ул. Аннаева, 49/1-1, кабинет юрисконсульта, либо в день проведения собрания 21 апреля 2025 года – по месту его проведения.**

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ В ФОРМЕ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона/ Оператор ЭТП** | ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 5, www.ipmtorgi.by |
| **Продавец 1** | Гражданин Республики Беларусь Киселёв В.В. |
| **Продавец 2** | Гражданин Республики Беларусь Киселёва И.А. |
| **Предмет электронного аукциона: 100 % доли в уставном фонде ООО «Фанипольский коммерческий центр», УНП 600317637, Минская обл., Дзержинский р-н, г. Фаниполь, ул. Я. Коласа, д. 1Б, комн. 2. 99 % доли в уставном фонде принадлежит Продавцу 1, 1 % доли принадлежит Продавцу 2** | |
| **Начальная цена без НДС – 330 000,00 бел. руб.** | |
| **Задаток 10 %** от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях по курсу НБРБ на дату внесения платежа перечисляется на расчетный счет BY92BELB30120048350080226000 в ОАО «Банк БелВЭБ», БИК BELBBY2X. Получатель платежа – ООО «ИПМ-Консалт оценка», УНП 191 224 638 | |
| **Срок подписания договора купли-продажи** | **10** рабочих дней после электронных торгов. Продавец составляет и направляет договор для подписания победителю аукциона |
| **Условия оплаты предмета электронных торгов** | |
| Если между продавцом и покупателем (победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся приобрести предмет электронных торгов по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета электронных торгов, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** после заключения договора купли-продажи | |
| **Порядок проведения и оформления участия в электронных торгах** | |
| **Порядок проведения электронных торгов, критерии выявления победителя торгов, порядок оформления участия в торгах и результатов торгов установлены регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by** | |
| Победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить вознаграждение **4 %** от цены продажи лота в течение 3 рабочих дней после проведения электронных торгов | |
| Организатор электронных торгов имеет право снять предмет аукциона с электронных торгов в любое время до момента определения победителя электронных торгов, без объяснения причин снятия | |
| **Дата и время начала и окончания электронных торгов: 16.05.2025 г. с 11.00 до 13.00.** Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов | |
| **Дата и время окончания приема заявок** | **Заявки на участие в электронных торгах принимаются по 15.05.2025 г. до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by** |
| **Контактные данные** | **Тел.: +375 17-373-21-33; +375 44 704-92-06. E-mail: auction@ipmconsult.by; info@ipmtorgi.by** |


БЛІЗКАЯ ЎЛАДА

# «АДЗІН З НАШЫХ АСНОЎНЫХ КІРУНКАЎ ДЗЕЙНАСЦІ»

## Наталля КАЧАНАВА правяла прыём грамадзян

Пытанні, з якімі людзі прыйшлі на прыём да Старшыні Савета Рэспублікі, — самыя разнастайныя. Сярод іх — парадак налічэння пенсій, пытанні працаўладкавання і атрымання грамадзянства, паляпшэнне жыллёвых умоў і многія іншыя. Усе яны па традыцыі былі падрабязна растлумачаны і ўзяты Наталляй Качанавай на асабісты кантроль.



Фота БелТА.

### ПЕНСІЯ ЗА «ШКОДНАСЦЬ»

На прыём да Старшыні Савета Рэспублікі прыехалі людзі з самых розных куткоў нашай краіны. Сярод іх — **жыхар Гродна Павел Генадзьевіч.** Мужчыну хвалюе пытанне пенсіённага забеспячэння. Паводле слоў заяўніка, ён амаль усё жыццё працаваў на адным з гродзенскіх прадпрыемстваў. Пачынаў звычайным рабочым на вытворчасці, якая лічылася «шкоднай». Пазней мужчыну павысілі на пасадзе, і ён стаў начальнікам участка. Таму паўстала пытанне з выхадам на пенсію «па шкоднасці» раней за належны тэрмін.

Заяўнік прызнаўся, што з 2022 года афіцыйна не працуе, пенсію не атрымлівае. **Намеснік міністра працы і сацыяльнай абароны Ігар СТАРАВОЙТАЎ** растлумачыў, што праца звычайнага рабочага ў цэху ў адпаведнасці з заканадаўствам з'яўлялася падставай для прадастаўлення датэрміновай пенсіі за «шкоднасць», «аднак пасада начальніка ўчастка, якую ён атрымаў у 1994 годзе, не лічыцца «шкоднай», яе ніколі не было ў адпаведных спісах. Таму, калі заяўнік звярнуўся да свайго наймальніка, той абгрунтавана не падаў даведку — да пенсіі мужчыне неабходна было дапрацаваць яшчэ пяць гадоў».

«Вы лічыце, калі чалавек нараўне са звычайнымі рабочымі працуе ў цэху, дзе проста дэманічная вытворчасць, правамерна не ўключаць яго пасаду ў гэты спіс? — задала пытанне прадстаўніку ведамства Наталля Качанава. — Ён жа не сядзіць у кабінеце цэлы дзень. Трэба праводзіць атэстацыю працоўных месцаў для таго, каб разумець: ёсць там шкоднасць ці не». Спікер даручыла Міністэрству працы і сацыяльнай абароны і кіраўніцтву прадпрыемства разабрацца ў сітуацыі.

### І РАБОТУ ЗНАЙСЦІ, І СЫНА ДАГЛЕДЗЕЦЬ

**Жыхарка Барысава Наталля Анатольеўна** нарадзілася ў Туркменістане. З 2002 года яна жыве ў нашай краіне, выхоўвае дзіця з сіндромам дэфіцыту ўвагі і гіперактыўнасці (СДУГ). Заяўніца афіцыйна не працаўладкаваная, таму не можа атрымаць грамадзянства. Яна звярнулася да Старшыні Савета Рэспублікі з просьбай аб працаўладкаванні, каб можна было адначасова і працаваць, і даглядаць дзіця.

Наталля Качанава ўважліва выслухала заяўніцу. «Неабходна вас абследаваць і ў адпаведнасці са станам здароўя падабраць работу. Я вам шчыра кажу, Наталля Анатольеўна, калі вы хочаце застацца ў Беларусі, атрымаць грамадзянства, вам трэба працаўладкавацца», — падкрэсліла спікер.

У размове з журналістамі жыхарка Барысава адзначыла, што цяпер, пасля прыёму ў Старшыні Савета Рэспублікі, упэўнена, што лёд кранецца: «Я вельмі ўдзячная Наталлі Іванаўне за тое, што яна прапанавала мне прайсці поўнае абследаванне і выявіць усе праблемы са здароўем. Дзякуй ёй за тое, што яна так уважліва паставілася да маёй праблемы, выслухала і прапанавала варыянты яе вырашэння».

### КАБ НЕ ВЫСЕЛІЛІ З ДЗЕЦЬМІ З ІНТЭРНАТА...

**Мінчанін Аляксандр Мікалаевіч** прыйшоў на прыём да Старшыні Савета Рэспублікі з жыллёвым пытаннем. Разам з жонкай, бацькамі і двума малалетнімі дзецьмі (2 і 4 гады) пражываюць у інтэрнаце. Пры гэтым маладая сям'я ўжо паўтара года спрабуе перазаключыць дагавор найму жылога памяшкання, але беспаспяхова. Раз за разам ім адмаўляюць па прычыне таго, што муж і жонка працуюць у арганізацыях сталіцы, а не Мінскай вобласці або раёна.

«Маладым людзям у любым выпадку неабходна падоўжыць дагавор найму жылога памяшкання, — заявіла Наталля Качанава. — Гэта маладая сям'я, у іх двое дзяцей, плюс жанчына цяпер у дэкрэце, няхай жывуць. Маладыя людзі малайцы, нараджаюць нам дзяцей, таму ў гэтай сітуацыі і нам трэба пайсці насустрач». Спікер распарадзілася адправіць хадайніцтва аб прадаўжэнні дагавора аб пражыванні сям'і ў інтэрнаце старшыні Мінскага аблвыканкама Аляксею Кушнарэнку, а таксама ліст старшыні Мінскага гарвыканкама Уладзіміру Кухараву з просьбай пасадзейнічаць у вырашэнні гэтай праблемы.

Наталля Качанава параіла маладой сям'і пачаць займацца будаўніцтвам свайго жылля: «Пашукайце ўсё ж такі магчымасці будаўніцтва. Я разумею, што гэта складана, патрэбны сур'ёзныя грошы. Але трэба пачынаць, вы ўсё роўна будзеце плаціць, а вам, маладой сям'і з дзеткамі, неабходна сваё жыллё».

### «КАБ ЛЮДЗІ АТРЫМЛІВАЛІ МАКСІМАЛЬНА ДАПАМОГУ»

Падводзячы прамежкавыя вынікі прыёму грамадзян, у размове з журналістамі Старшыня Савета Рэспублікі адзначыла: «Гэта адзін з нашых асноўных напрамкаў дзейнасці. Гэта, перш за ўсё, вельмі важна, працуючы над законапраектамі, разглядаць пытанні грамадзян, таму што дапаўненні і змяненні, якія ўносяцца ў законы, павінны быць актуальнымі і жыццёва важнымі для нашых грамадзян і для нашай краіны. Мы працуем і каардынуем работу дэпутацкага корпуса ўсіх узроўняў, пачынаючы ад сельскіх Саветаў. А асноўная функцыя дэпутатаў любога ўзроўню — гэта работа з людзьмі. І таму, вядома, мы бачым, дзе яна выбудаваная лепш і людзі кажуць пра гэта, а дзе ёсць пытанні да мясцовых органаў улады, і, у прыватнасці, да нашых органаў самакіравання, такіх, як сельскія Саветы ці, напрыклад, раённыя або гарадскія Саветы дэпутатаў».

Паводле слоў спікера, члены Савета Рэспублікі робяць усё для таго, каб такія прыёмы праходзілі найбольш эфектыўна, каб людзі максімальна атрымлівалі дапамогу, звярнуўшыся да сенатараў.

Наталля Качанава падкрэсліла, што Прэзідэнт Беларусі даручыў трымаць на кантролі ўсе звароты, якія паступілі падчас выбарчай кампаніі: «Мы правялі шмат сустрэч у розных арганізацыях і ўважліва адсочваем гэту сітуацыю, бо звароты, прапановы і просьбы паступалі не проста ад фізічных асоб, а ў большай ступені — гэта звароты, якія хвалявалі працоўныя калектывы. Таму мы трымаем гэта пытанне на кантролі. Я ўжо дакладвала Прэзідэнту, якія пытанні вырашаны і якія знаходзяцца на кантролі».

Сёння, паводле слоў спікера Савета Рэспублікі, на кантролі застаецца 551 зварот, з іх па 194-м былі дадзены тлумачэнні. «Прэзідэнт нашай краіны паставіў задачу перад кіраўнікамі ўсіх органаў улады, што ўсе абяцанні, якія дадзены людзям у ходзе выбарчай кампаніі, павінны быць выканаваны», — падагульніла спікер.

Дарэчы, за студзень-сакавік 2025 года членамі Савета Рэспублікі праведзена 233 асабістыя прыёмы, 90 прамых тэлефонных ліній, 694 сустрэчы з працоўнымі калектывамі і насельніцтвам па месцы жыхарства. У Савет Рэспублікі паступіла 2 190 зваротаў, да членаў Прэзідыума — 1 389.

**Данііл ХМЯЛЬНІЦКІ.**

ПАРЛАМЕНЦКІ ДЗЁННІК

# «ПРАЦАВАЦЬ НА ПЕРСПЕКТЫВУ, УЛІЧВАЮЧЫ ДЭМАГРАФІЧНЫЯ ВЫКЛІКІ І ІНТАРЭСЫ БУДУЧЫХ ПАКАЛЕННЯЎ»

**На семінары-нарадзе ў Палаце прадстаўнікоў абмеркавалі Канцэпцыю дзяржаўнай жыллёвай палітыкі Беларусі да 2030 года**



Фота БелТА.

У полі зроку дэпутацкага корпуса — механізмы дзяржаўнай падтрымкі пры жыллёвым будаўніцтве, горадабудаўнічае забеспячэнне ажыццяўлення рэнавацый у краіне. Асобная ўвага ўдзелена новаўвядзенням у жыллёвым заканадаўстве. Сярод іх — прадастаўленне арэнднага жылля прадстаўнікам найбольш запатрабаваных прафесій, набыццё жылых памяшканняў дзяржаўнага жыллёвага фонду ў сельскай мясцовасці. На семінары-нарадзе разгледжаны кірункі ўдасканалення нарматыўнай прававой базы ў гэтай сферы.

## АСНОВА СТАБІЛЬНАСЦІ І ДАБРАБЫТУ

Як адзначыў **Старшыня Палаты прадстаўнікоў Ігар СЕРГЯЕНКА**, Канцэпцыя дзяржаўнай жыллёвай палітыкі да 2030 года стала вынікам дзейнасці міжведамаснай рабочай групы з удзелам дэпутацкага корпуса. Гэты дакумент, па словах спікера, вызначае стратэгічныя кірункі для забеспячэння грамадзян даступным, камфортным жыллём, што з'яўляецца адной з прыярытэтных задач, пастаўленых Прэзідэнтам.

«Кіраўнік дзяржавы неаднаразова падкрэсліваў, што жыллё — гэта не проста квадратныя метры, не проста сцены і дах над галавой, гэта аснова стабільнасці і дабрабыту ў кожнай сям'і, умова для рэалізацыі патэнцыялу грамадзян і важны элемент сацыяльнай справядлівасці, — канстатаваў Старшыня Палаты прадстаўнікоў. — Будаваць трэба там, дзе ёсць патрэба ў кадрах».

Пастаўленыя задачы, як падкрэсліў спікер, патрабуюць ад дэпутацкага корпуса, іншых дзяржаўных органаў комплексных рашэнняў. «Неабходна працаваць на перспектыву, улічваючы дэмаграфічныя выклікі і інтарэсы будучых пакаленняў, — канкрэтызаваў ён. — Канцэпцыя змяшчае шэраг пытанняў, далейшае вырашэнне якіх патрабуе неадкладнага прыняцця мер, у тым ліку заканадаўчага характару».

Ігар Сергяенка звярнуў увагу на крытычны стан жыллёвага фонду. Ен праінфармаваў, што ў наяўнасці — 190 тысяч квадратных метраў аварыйнага жылля, пераважна ў сельскай мясцовасці. «Больш за 9 % жылля не абсталявана водаправодам, 11 % — каналізацыяй, амаль 20 % — гарачым водазабеспячэннем, — агучыў праблему спікер. — Пры гэтым у краіне налічваецца 110 тысяч жылых дамоў, а таксама больш за 17 тысяч кватэр, у якіх ніхто не зарэгістраваны і не пражывае».

Другое пытанне, на якім засяродзіў увагу Старшыня Палаты прадстаўнікоў, — дысбаланс у развіцці рэгіёнаў і адток насельніцтва ў буйныя гарады. І гэтая праблема, па яго словах, увесь час пагаршаецца.

«Па-трэцяе, асаблівую заклапочанасць выклікае сітуацыя з забеспячэннем жыллём найбольш уразлівых катэгорый грамадзян, у тым ліку тых, хто мае права на атрыманне жылых памяшканняў сацыяльнага карыстання, — канкрэтызаваў Ігар Сергяенка. — Аналагічная сітуацыя складваецца і па тэмпах будаўніцтва жылых памяшканняў для адсялення грамадзян, якія пражываюць у старых і аварыйных жылых дамах. Пабудавана 95 кватэр пры патрэбнасці больш чым 3,5 тысячы, а таксама для дзяцей-сірот — 864 пры патрэбнасці больш за 27 тысяч».

Па словах спікера, гэта толькі малая частка праблем, звязаных з забеспячэннем жыллём грамадзян. «Гэтыя і многія іншыя пытанні рэгулярна ўзнімаюцца ў зваротах грамадзян перад дэпутатамі, — падкрэсліў ён. — Канцэпцыя дзяржаўнай жыллёвай палітыкі да 2030 года — гэта адпраўны пункт для вырашэння задачы павышэння даступнасці жылля ў краіне».

## 21,4 МЛН «КВАДРАТАЎ» ЗА ПЯЦІГОДКУ

Як акцэнтаваў увагу **міністр архітэктуры і будаўніцтва Аляксандр СТУДНЕЎ**, жыллёвы фонд на 1 студзеня мінулага года склаў 273,6 мільёна кв. м агульнай плошчы жылля. У той час 30 гадоў таму яго агульная плошча складала ўсяго толькі 200 млн «квадратаў».

«Толькі ў бягучай пяцігодцы плануецца пабудаваць 21,4 мільёна квадратных метраў жылля, — праінфармаваў міністр. — У выніку дзяржаўнай палітыкі, якая праводзіцца, колькасць чаргавікоў з 2010-га зменшылася з 855,6 тыс. да 558,4 тыс. За 14 гадоў чарга скарацілася амаль на 300 тысяч чалавек. Аб'ёмы будаўніцтва жылля па выніках мінулага года дазволілі дасягнуць забяспечанасці на аднаго чалавека ў памеры 30,4 квадратных метра, у той час як у 1995-м паказчык складаў усяго толькі 19,7 кв. м. Пры гэтым выконваюцца ўстаноўленыя дырэктывай кіраўніка дзяржавы суадносіны кошту аднаго метра жылля з дзяржпадтрымкай да сярэдняга ўзроўню заработнай платы».

Штогод паляпшаюць свае жыллёвыя ўмовы ў сярэднім 25 тысяч сем'яў. Дзяржаўная палітыка дае магчымасць грамадзянам, якія маюць такую патрэбу, пабудаваць жыллё ва ўласнасць з выкарыстаннем ільготных або субсідзіраваных крэдытаў. Сацыяльна неабароненыя грамадзяне, дзеці-сіроты, сем'і, якія маюць дзяцей-інвалідаў, іншыя малазабяспечаныя грамадзяне атрымліваюць сацыяльнае або арэнднае жыллё.

Нягледзячы на гэта, у галіне рэалізацыі жыллёвай палітыкі ёсць пытанні, якія патрабуюць рашэння. Сярод іх — нізкія тэмпы забеспячэння жыллём дзяцей-сірот, недастатковыя аб'ёмы будаўніцтва арэнднага жылля. Па словах міністра, попыт на яго апярэджвае прапанову, асабліва ў вялікіх гарадах.

«Разам з тым арэнднае жыллё з'яўляецца дзейсным механізмам, які дазваляе ў першую чаргу вырашаць задачы прыцягнення і замацавання запатрабаваных кадраў на месцах», — адзначыў міністр архітэктуры і будаўніцтва. Ен нагадаў, што такое жыллё ў краіне будуецца з 2012 года выключна за кошт бюджэтных сродкаў. Калі ў 2012-м узведзена толькі 10,7 тысячы квадратных метраў жылля, то ў 2024-м — 427 тыс. «квадратаў». План на бягучы год — 442 тысячы кв. м.

Патрабуе ўвагі пытанне паляпшэння жыллёвых умоў чаргавікоў, якія не маюць права на дзяржаўную падтрымку, пры абмежаваных аб'ёмах арэнднага жылфонду і высокіх працэнтных стаўках па камерцыйных крэдытах. Рашэннем праблемы, на думку міністра, можа выступаць сістэма жыллёвых будаўнічых зберажэнняў, парадак функцыянавання якой прадугледжаны адпаведным Указам. Кажучы аб праблеме састарэлага жылфонду, Аляксандр Студнеў бачыць выйсце з сітуацыі забеспячэннем паэтапнай рэканструкцыі і рэнавацыі жыллёвага фонду.

**Вераніка КАНЮТА.**

Центр Промышленной Оценки

• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ В ФОРМЕ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 2. УНП 191021390 |
| **Продавец** | ОАО «Белцветмет», Минская обл., Минский р-н, Новодворский с/с, 42/2, район аг. Гатово. УНН 100088666 |
| **Оператор ЭТП** | ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 1 (www.ipmtorgi.by) |

**Предмет электронных торгов:** бывшее в употреблении имущество. Местоположение – Минский р-н, Новодворский с/с, аг. Гатово, 42/2

| № лота | Наименование | Начальная цена с НДС 20 %, бел. руб. |
|---|---|---|
| 1 | **Автомобиль MAZ 6501A8-325-000,** 2013 г. в. | **18 528,00** |
| 2 | **Прицеп MAZ 856103-(010), А 8286 В-5,** 2013 г. в. | **9 312,00** |
| 3 | **Прицеп MAZ 856103-(010), А 8287 В-5,** 2013 г. в. | **9 312,00** |

***Цена снижена на 60 %. Шаг аукциона: 5 % от текущей цены***

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета электронных торгов перечисляется на р/счет BY47 BELB 3012 0028 5000 3022 6000 в ОАО «Банк БелВЭБ», БИК BELBBY2X, УНП 191 021 390. Получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

| | |
|---|---|
| **Срок подписания договора купли-продажи** | **10 (десять)** рабочих дней со дня завершения электронных торгов |
| **Условия оплаты предмета электронных торгов** | **10 (десять)** рабочих дней с даты заключения договора купли-продажи |

**Порядок проведения электронных торгов, критерии выявления победителя торгов, порядок оформления участия в торгах и результатов торгов установлены регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by**

Победитель электронных торгов либо единственный участник торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить установленное вознаграждение по лоту № 1 – 5 %, по лотам №№ 2, 3 – 7 % от цены продажи лотов в течение 3 (трех) рабочих дней после проведения электронных торгов

Предыдущее извещение опубликовано в газете «Звязда» 19.03.2025

**Дата и время начала и окончания электронных торгов: с 11.00 до 12.00 24.04.2025.**
Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов

Заявки на участие в электронных торгах принимаются по **23.04.2025 до 17.00** на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by

**Контактные телефоны: +375 17-373-21-33; +375 29-317-95-42. E-mail: auction@cpo.by**

Брестский филиал
РУП «Институт недвижимости и оценки»
ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

**Лот № 1: зерноуборочный комбайн КЗС-1218, год выпуска 2011 г., регистрационный знак АВ-1 9384**

| | | | |
|---|---|---|---|
| **Начальная цена, руб. (без учета НДС)** | 21 200,00 | **Размер задатка, руб.** | 2 120,00 |

**Местоположение объекта:** Брестская обл., Брестский р-н, аг. Вистычи, ул. Центральная, 22. **Продавец:** ОАО «Агро-сад Рассвет», 225031, Брестская обл., Брестский р-н, аг. Вистычи, ул. Центральная, 22, тел. 80162919132. **Организатор торгов:** Брестский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Брест, ул. Наганова, 10-329, тел./факс 80162408701. Задаток вносится на расчетный счет Организатора аукциона до подачи заявления. Р/с для перечисления задатка: BY32BAPB30127866600100000000, в ОАО «Белагропромбанк» ЦБУ № 116 в г. Брест, РД по Брестской области, код банка BAPBBY2X, УНП 201028245, код платежа 40901. Условия продажи: без условий. **Срок заключения договора купли-продажи:** в течение 20 рабочих дней со дня проведения аукциона. **Условия оплаты:** согласно заключенному договору купли-продажи. **Информация о возмещении затрат:** участник аукциона, выигравший торги, оплачивает Продавцу НДС в размере 20 % от стоимости продажи объекта, а также в течение 3 рабочих дней со дня аукциона возмещает фактические затраты на организацию и проведение аукциона, включающие вознаграждение Организатора аукциона. **Срок возможного отказа от проведения аукциона:** не позднее чем за 3 календарных дня до наступления даты проведения аукциона

**Аукцион состоится 13 мая 2025 г. в 11.00 по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-325**

Сведения о документах, которые необходимо предоставить для участия в аукционе, порядок, в соответствии с которым проводится аукцион, иная информация содержатся на сайте Организатора аукциона **www.ocenkabrest.by,** также можно узнать по телефонам: **8 (0162) 40-87-01, 40-87-02**

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-329 в рабочие дни с 9.00 до 17.00**

**Последний день приема заявлений – 12 мая 2025 г. до 17.00**

Уважаемые акционеры открытого акционерного общества «Гомельская мебельная фабрика «Прогресс»!
25 апреля 2025 года в 11.00
состоится внеочередное общее собрание акционеров

Место нахождения Общества: г. Гомель, ул. Лещинская, 49.
Повестка дня собрания: о выплате дивидендов.
Место проведения собрания: г. Гомель, ул. Лещинская, 49 (актовый зал).
Время регистрации в день проведения собрания с 10.30 до 11.00.
Для регистрации при себе иметь: акционеру – паспорт, представителю акционера – паспорт и доверенность.
Время и место ознакомления акционеров с материалами по вопросам повестки дня собрания: с 17.04.2025 в рабочие дни с 11.00 до 13.00, в день проведения собрания – с 9.00 до 11.00 по адресу: г. Гомель, ул. Лещинская, 49.
Дата формирования реестра акционеров для составления списка лиц, имеющих право на участие в общем собрании акционеров, – 16.04.2025, определена решением наблюдательного совета от 09.04.2025.
Справки по телефону 8 (0232) 341817.

Наблюдательный совет

УНП 400078768

# 125 ГРАМАЎ ХЛЕБА І МІЛЬЁН СЛЁЗ

## Чым запомніўся канцэрт-рэквіем «Кожны трэці», які наш карэспандэнт паглядзела разам з прадстаўнікамі Гродзеншчыны



У памяць аб ахвярах Вялікай Айчыннай вайны і аб подзвігу продкаў, якія здабылі Перамогу, у Палацы Рэспублікі з 6 па 12 красавіка праходзяць канцэрты-рэквіемы «Кожны трэці». Па распараджэнні Прэзідэнта яны арганізаваныя для жыхароў усіх абласцей і Мінска. Увечары ў сераду яго гледачамі сталі прадстаўнікі Гродзенскай вобласці.

**Намеснік прэм'ер-міністра Уладзімір КАРАНІК,** які прысутнічаў на канцэрце разам з дэлегацыяй вобласці, якую ён да нядаўняга часу ўзначальваў, адзначыў:

— Наша пакаленне размаўляла з ветэранамі. Мы разумелі, якой цаной далася перамога, якія жахі перажыў наш народ. І наша задача — перадаць гэту інфармацыю моладзі, — заявіў ён. — Калі падлеткам расказваеш гісторыі, прыводзіш лічбы, яны слухаюць, слухаюць уважліва. Але калі бачаць кадры хронікі, сваіх аднагодкаў за калючым дротам, у якіх бяруць кроў, то выходзяць з залы са слязамі на вачах. І ты разумееш, што яны прачулі. І яны зробяць усё, каб гэта не паўтарылася. Мы разам зробім усё, каб над нашай любімай краінай заўсёды было чыстае мірнае неба.

Пра тое, што на Прынёманскіх рубяжах, як і ў Брэсцкай крэпасці, быў сарваны нямецкі план вокамгненнай вайны «Бліцкрыг», нагадаў у пачатку канцэрта ўсім прысутным **старшыня Гродзенскага аблвыканкама Юрый КАРАЕЎ:**

— Бясстрашныя воіны-пагранічнікі і байцы Чырвонай Арміі Гродзенскага ўмацаванага раёна прымусілі нямецка-фашысцкіх захопнікаў спыніцца і ісці не па плане. Змагаліся да канца. Нашы землякі ваявалі ў Чырвонай Арміі, у партызанскіх атрадах і ў падполлі, набліжаючы Вялікую Перамогу. За вызваленне Ліды, Слоніма, Ваўкавыска і Гродна доблесным войскам беларускіх франтоў салютавала Масква.

Пагасла святло — і ў зале запанавала цішыня. На вялізным экране — чорна-белыя кадры ваеннай хронікі. І голас за кадрам: «22 чэрвеня 1941 года фашысцкая Германія подла і вераломна напала на Савецкі Саюз. Пачалася самая кровапралітная вайна ў гісторыі чалавецтва». Гэтымі словамі адкрыўся канцэрт-рэквіем «Кожны трэці», прымеркаваны да 80-годдзя Перамогі. Рэквіем па амаль паўтара мільёну савецкіх грамадзян, чые жыцці абарваліся ў канцлагерах акупаванай тэрыторыі Беларусі. Па 9 тысячах спаленых вёсак, 209 разбураных гарадах. Па 570 лагерах смерці, 14 з якіх — для дзяцей. Па кожным трэцім беларусе — ад малога да старога.

Са сцэны не гучаць пафасныя прамовы і парадныя маршы. Толькі сапраўдныя дакументы, факты, лічбы. А яшчэ — радкі з вядомага верша Анатоля Вярцінскага «Рэквіем па кожным чацвёртым» (калі паэт яго пісаў, былі звесткі аб загінулым кожным чацвёртым, на жаль, з таго часу лічба павялічылася да кожнага трэцяга). Менавіта да яго адсылае назва праекта, першапачаткова створанага для паказу ў маскоўскім Музеі Перамогі на Паклоннай гары. Пасля трыумфальнай прэм'еры ў Расіі было вырашана: унікальны канцэрт павінен убачыць і беларускі глядач. 22 чэрвеня, у Дзень усенароднай памяці ахвяр Вялікай Айчыннай вайны, пастаноўка ўпершыню прайшла ў Палацы Рэспублікі.

### «КАЛІ СТАІШ НА СЦЭНЕ І БАЧЫШ, ЯК ЛЮДЗІ Ў ЗАЛЕ ПЛАЧУЦЬ, ЧАСАМ САМОМУ НЕМАГЧЫМА СТРЫМАЦЦА»

Аснову канцэрта склалі папулярныя музычныя кампазіцыі савецкай эпохі і работы сучасных беларускіх аўтараў, сярод якіх Валерый Шмат, Ганна Сялук, Яўгеній Алейнік, Ганна Благава і іншыя. Адной з самых кранальных стала песня «Ты раскажы дзіцяці пра вайну» ў выкананні маладых артыстаў — Арцёма Скароля і Леры Бернатовіч:




— Яна пра тое, што дзецям трэба больш расказваць пра тыя часы, Перамогу, яе герояў, — распавёў Арцём Скароль. — Але калі ты стаіш на сцэне і бачыш, як у зале людзі плачуць — часам самому немагчыма стрымацца.

— Гэта ўжо наш чацвёрты канцэрт, і ніводзін не абышоўся без слёз. Мы самі не можам выконваць гэту песню без эмоцый, — прызналася Лера Бернатовіч. — У тым ліку таму, што разумеем усю значнасць праекта «Кожны трэці».

Сваімі эмоцыямі ад удзелу ў ім падзяліліся і салісткі рэтра-вумен-трыа «Ружовыя ружы» Марына Путнікава, Кацярына Муратава і Вольга Змуршчык:

— Шчыра, па-сапраўднаму і абавязкова з чыстым сэрцам мы выходзім на сцэну канцэрта-рэквіема «Кожны трэці». Усё настолькі прыгожа зроблена, што кожны твор кранае да глыбіні душы. І мы жадаем, каб людзі змаглі пражыць разам з намі кожную эмоцыю. Каб разумелі, што такое вайна і чаму яна не павінна паўтарыцца.

На працягу ўсяго канцэрта зала не раз апладзіравала стоячы, аддаючы даніну павагі тым, хто змагаўся за мір. Моцнае ўражанне пакінула песня «Да канца» — пранізлівы гімн мужнасці і стойкасці абаронцаў Айчыны, неабходнасці захоўваць памяць аб іх подзвігу, заставацца чалавекам да апошняга ўздыху.

Архіўныя фотаздымкі змяняліся на экране: пустыя позіркі забітых, партызаны з вінтоўкамі наперавес, гара дзіцячых чаравічкаў у Трасцянцы... Гэтыя дакументальныя фота- і відэаматэрыялы нікога не пакінулі абыякавым. Як і песня «Голас мамы». Яна асабліва закранула **інструктара-метадыста са Слоніма Іну ЮРЧЫК:**

— Было немагчыма не плакаць, калі паказвалі, праз што падчас вайны праходзілі дзеці. І наогул, тэма генацыду беларускага народа, асабліва пакуты дзяцей мяне вельмі глыбока ўразілі на гэтым канцэрце. Артысты па-майстэрску перадалі ўвесь боль і трагізм таго часу. Гэта адначасова кранальна і страшна.

### «ГОНАР БЯРЭ ЗА БЕЛАРУСКІ НАРОД, ШТО ЗДОЛЕЎ ПЕРАЖЫЦЬ І ВЫСТАЯЦЬ»

Перад канцэртам і пасля яго ў фае Палаца Рэспублікі — мора людзей. Тут прадстаўлены шэраг тэматычных выставачных праектаў. Хтосьці ўглядаецца ў лісты-трохвугольнікі, хтосьці — уважліва вывучае карты акупаваных фашыстамі беларускіх тэрыторый.

Напрыклад, выстаўка «Подзвігі і лёсы партызан у дакументах» заснавана на матэрыялах інтэрнэт-праекта «Партызаны Беларусі» (partizany.by) выдавецкага дома «Беларусь сегодня» і Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь. На стэндах — унікальныя фатаграфіі, узнагародныя лісты, баявыя характарыстыкі. Праект, удастоены Спецыяльнай прэміі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, дазваляе кожнаму знайсці інфармацыю пра сваіх продкаў-партызанаў. А вось рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Культура і мастацтва» разам са студэнтамі Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў «ажывіла» палотны з фондаў Беларускага дзяржаўнага музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны з дапамогай тэхналогіі дапоўненай рэальнасці.

У экспазіцыі «Генацыд: дакументы і відавочцы сведчаць» Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі раскрываюцца сутнасць і змест розных форм гэтай страшнай з'явы: ад жахаў канцлагераў і трагедыі Халакоста да спаленых вёсак, карных аперацый і эксплуатацыі мясцовага насельніцтва. Апроч кніжных выданняў прадстаўлены тэматычныя плакаты ад выдавецтва «Беларусь», створаныя на аснове сучасных следчых матэрыялаў. Асаблівы экспанат — партызанскі пераносны млын 1943 года — сімвал народнай кемлівасці і супраціўлення, барацьбы за жыццё ва ўмовах татальнага голаду.

На гэту тэму — ролі хлеба ў гады вайны — і выстава ад КУП «Мінскхлебпрам». Прадпрыемства сабрала фатаграфіі хлебазаводаў і рэцэпты, а таксама прывезла пяць відаў хлеба, выпечаных па тэхналогіях 1940-х. На стале з дэгустацыяй — шалі з кавалачкам у 125 грамаў. Гэта норма тылу і фронту таго страшнага часу:

— З намі прыехала настаўніца пачатковых класаў, якая ўзяла крыху хлеба з сабой. Хоча паказаць дзецям, чым сілкаваліся людзі ў ваенныя гады, які жудасны голад яны перажылі. Гонар бярэ за беларускі народ, што здолеў перажыць і выстаяць, — гаворыць **Віта БАРАДЫН, бібліятэкар Геранёнскай сярэдняй школы Іўеўскага раёна.**

Нават праз 80 гадоў боль вайны застаецца агульным. Але такія праекты, як «Кожны трэці», якія распавядаюць пра Вялікую Айчынную вайну без прыкрас, без замоўчванняў, з'яўляюцца падмуркам таго, што трагедыя не паўторыцца. Бо гэта не толькі аповед пра мінулае, але і наглядны ўрок на будучыню.

**Аміна НАЗАРАВА.**
**Фота Віктара ДРАЧОВА.**




### • На фронце

Звестак пра сітуацыю на 11 красавіка захавалася няшмат. Савецкае інфармбюро паведамляла, што ў гэты дзень на ўсіх франтах было падбіта і знішчана 50 нямецкіх танкаў і самаходных гармат. У паветраных баях і агнём зенітнай артылерыі было збіта 22 самалёты праціўніка.



### • У тыле

Перад сістэмай дзяржаўных працоўных рэзерваў на той час была пастаўлена сур'ёзная задача — падрыхтаваць высокакваліфікаваных рабочых масавых прафесій для сацыялістычнай прамысловасці, будаўніцтва, чыгуначнага транспарту і другіх галін народнай гаспадаркі краіны.

Задача гэта асабліва ўзрасла ва ўмовах Вялікай Айчыннай вайны, калі многія з рабочых былі закліканы на абарону Радзімы, у рады Чырвонай Арміі, а разбураная нямецка-фашысцкімі вылюдкамі народная гаспадарка патрабавала аднаўлення. «**Важнейшымі крыніцамі папаўнення кваліфікаванымі рабочымі і работніцамі масавых прафесій нашых прадпрыемстваў з'яўляюцца рамесніцкія, чыгуначныя вучылішчы і школы фабрычна-заводскага навучання», — пісала «Звязда».**

У Беларускай ССР на той час аднавілі сваю дзейнасць звыш 50 рамесніцкіх, чыгуначных вучылішчаў і школ ФЗН. У іх навучалася каля 11 тысяч юнакоў і дзяўчат. «**Яны атрымліваюць веды па спецыяльнасцях — памочнікаў паравозных машыністаў, дзяжурных па станцыі, слесараў, токараў, электраманцёраў, друкароў, наборшчыкаў, цесляроў, штукатураў, каменшчыкаў і другіх прафесій», — пісала наша газета.**

Больш за тры тысячы маладых рабочых будаўнічых спецыяльнасцяў працавалі на прадпрыемствах Беларусі, выконваючы і перавыконваючы нормы. Сярод іх — былыя вучні школы ФЗН № 5 горада Касцюкоўкі (цяпер гэта мікрараён Гомеля): «**Штукатуры Ксеня Еўсеенка і А. Тузава, столяр Уладзімір Бокараў, цясляр Герасім Вераснёў працуюць на гомельскім шклозаводзе імені Сталіна і зарэкамендавалі сябе тут як добрыя кваліфікаваныя рабочыя. Яны дабіваюцца высокай прадукцыйнасці працы, сістэматычна перавыконваюць дзённае заданне».**

**Упартай і прадуктыўнай працай адрозніваліся таксама вучні Нікалай Гутароеў, Якаў Касабукін, якія скончылі школу ФЗН № 6 у горадзе Добрушы і працавалі на фабрыцы «Герой працы», выконваючы зменныя заданні на 120—150 %.**

**Каля 5 тысяч вучняў у маі павінны былі скончыць навучанне і атрымаць кваліфікацыю. «Яны раз'едуцца па прадпрыемствах і будоўлях Беларусі для самастойнай работы», — адзначалася ў газеце.**



Начальнік аддзела мабілізацыі, размеркавання і ўліку пры рэспубліканскім упраўленні працоўных рэзерваў БССР А. Чунаеў заклікаў: «Кіраўнікам прадпрыемстваў, будоўляў і чыгуначнага транспарту неабходна загадзя падрыхтаваць арганізаваную сустрэчу маладым рабочым, забяспечыць іх добра абсталяванымі інтэрнатамі, стварыць неабходныя культурна-бытавыя ўмовы для плённай працы».

**У сваю чаргу «партыйным, савецкім, камсамольскім і прафсаюзным арганізацыям неабходна ўдзяліць максімум увагі і аказваць практычную дапамогу гаспадарнікам у падрыхтоўцы жылля і культурна-масавага абслугоўвання выпускнікоў школ ФЗН, каб гэта садзейнічала далейшаму вытворчаму, культурнаму і палітычнаму росту маладых рабочых», — пісала «Звязда».**

**Вядучая рубрыкі Яна ВАЛАСАЧ.**


**Белгазпромбанк**
**Энергия твоего будущего!**

**Совместное белорусско-российское ОАО «Белгазпромбанк»**
220121, г. Минск, ул. Притыцкого, 60/2. Телефон для справок: 120

Данная отчетность опубликована на сайте ОАО «Белгазпромбанк» www.belgazprombank.by

Форма 1

**Бухгалтерский баланс**
**31 марта 2025 г.**
ОАО «Белгазпромбанк»

(в тысячах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | Пункт примечаний | 31.03.2025 | 31.12.2024 |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
| **1** | **АКТИВЫ** | | | | |
| 2 | Денежные средства | 1101 | | 237 919 | 219 244 |
| 3 | Драгоценные металлы и драгоценные камни | 1102 | | 6 961 | 8 423 |
| 4 | Средства в Национальном банке | 1103 | | 396 710 | 460 522 |
| 5 | Средства в банках | 1104 | | 652 372 | 656 961 |
| 6 | Ценные бумаги | 1105 | | 738 780 | 771 706 |
| 7 | Кредиты клиентам | 1106 | | 3 204 226 | 3 167 380 |
| 8 | Производные финансовые активы | 1107 | | - | - |
| 9 | Долгосрочные финансовые вложения | 1108 | | 1 675 | 1 675 |
| 10 | Основные средства и нематериальные активы | 1109 | | 191 104 | 190 532 |
| 11 | Доходные вложения в материальные активы | 1110 | | 239 | 245 |
| 12 | Имущество, предназначенное для продажи | 1111 | | 6 209 | 6 209 |
| 13 | Отложенные налоговые активы | 1112 | | - | - |
| 14 | Прочие активы | 1113 | | 27 882 | 34 914 |
| **15** | **ИТОГО активы** | **11** | | **5 464 077** | **5 517 811** |
| **16** | **ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | | |
| 17 | Средства Национального банка | 1201 | | 6 076 | 3 956 |
| 18 | Средства банков | 1202 | | 703 890 | 885 995 |
| 19 | Средства клиентов | 1203 | | 3 626 308 | 3 502 231 |
| 20 | Ценные бумаги банка | 1204 | | 12 950 | 28 899 |
| 21 | Производные финансовые обязательства | 1205 | | - | - |
| 22 | Отложенные налоговые обязательства | 1206 | | - | - |
| 23 | Прочие обязательства | 1207 | | 147 072 | 46 865 |
| 24 | ВСЕГО обязательства | 120 | | 4 496 296 | 4 467 946 |
| **25** | **СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ** | | | | |
| 26 | Уставный фонд | 1211 | | 407 982 | 348 161 |
| 27 | Эмиссионный доход | 1212 | | - | - |
| 28 | Резервный фонд | 1213 | | 247 350 | 186 450 |
| 29 | Фонды переоценки статей баланса | 1214 | | 63 594 | 78 118 |
| 30 | Накопленная прибыль | 1215 | | 248 855 | 437 136 |
| 31 | Всего собственный капитал | 121 | | 967 781 | 1 049 865 |
| **32** | **ИТОГО обязательства и собственный капитал** | **12** | | **5 464 077** | **5 517 811** |

Форма 2

**Отчет о прибылях и убытках**
**за 3 месяца 2025 г.**
ОАО «Белгазпромбанк»

(в тысячах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | Пункт примечаний | 31.03.2025 | 31.03.2024 |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
| 1 | Процентные доходы | 2011 | | 129 137 | 91 350 |
